Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

28 ВЕРАСНЯ 2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 185 (26050)
Кошт 440 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Б'ЕЦЦА СЭРЦА

Увага: «прамыя лініі»

Званіце, калі ласка, нашаму чарговаму госцю — **галоўнаму кардыёлагу Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, доктару медыцынскіх навук, прафесару 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Наталлі Паўлаўне МІЦЬКОЎСКАЙ.**

«Прамая лінія» адбудзецца СЁННЯ з 15.00 да 16.30 па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.

ПЕНСІЙНАЯ «РАСКЛАДКА»

Як і калі праводзіцца пераразлік пенсій, хто мае права на надбаўкі і павышэнні, што чакае пенсіянераў-датэрміноўшчыкаў, якія змяненні могуць адбыцца ў пенсійным заканадаўстве, а таксама асаблівасці вылічэння стажу і заробку — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» Звязды» з удзелам **начальніка Галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.**

Такім чынам, згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» адбудзецца 10 кастрычніка з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8-017) 292-38-21 і 292-38-92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287-17-57.

Узровень аховы дзяржграніцы павінен адпавядаць новым выклікам і пагрозам сучаснасці

Прэзідэнт Беларусі 27 верасня разгледзеў кадравыя пытанні. У сувязі са зменамі структуры пагранведамства кіраўнік дзяржавы назначыў:

Рачкоўскага Ігара Анатольевіча — старшынёй Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь

Зайцава Вадзіма Юр'евіча — першым намеснікам старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь — начальнікам галоўнага аператыўнага ўпраўлення

Прэзідэнт таксама назначыў:

Абызава Алега Барысавіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь — начальнікам галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння

Камарніцкага Яўгена Васільевіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь — начальнікам галоўнага ўпраўлення матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння

Гарульку Андрэя Георгіевіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь па рэжыму і арганізацыйнаму забеспячэнню.

«Размова ідзе не аб простым перайменаванні камітэта. Пагранічнікі надзяляюцца больш шырокімі функцыямі, што дасць магчымасць ім больш эфектыўна процістаяць негатыўным з'явам і процідзейнічаць праўпарушэнням дзеянням на граніцы», — сказаў Прэзідэнт.

Акрамя абавязкаў па ахове тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка асабліва вылучыў такія функцыі органаў пагранічнай службы, як абарона эканамічных інтарэсаў краіны, садзейнічанне развіццю знешнеэканамічных сувязяў.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, у пытаннях транзіту тавараў пагранічнікі павінны больш цесна супрацоўнічаць з мытнікамі.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на важнасць максімальнага захавання правоў і законных інтарэсаў людзей, якія перасякаюць граніцу. «Граніца для добрапрыстойных грамадзян Беларусі і гасцей нашай краіны не павінна быць бар'ерам. Па дзеяннях пагранічнікаў нярэдка ствараецца ў цэлым уражанне аб краіне», — адзначыў Прэзідэнт.

У той жа час беларуская граніца павінна стаць надзейнай перашкодай для злачыннага свету, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі ўчастак граніцы быў самым лепшым у СССР, і сёння неабходна падтрымліваць гэту высокую планку. Прэзідэнт запатрабаваў выкараняць і строга спыняць хабарніцтва, карупцыю, службовыя злачынствы ў пагранслужбе.

Паводле яго слоў, у пытаннях аховы дзяржаўнай граніцы каардынацыю намаганняў усіх праваахоўных органаў павінны ажыццяўляць толькі органы пагранічнай службы. Трэба будзе аптымізаваць колькасць пагранічнікаў: іх колькасць будзе павялічана непасрэдна на граніцы, а не ў кіруючым апараце або органах матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Пры гэтым агульная колькасць супрацоўнікаў камітэта не зменіцца.

Старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Ігар Рачкоўскі далажыў Прэзідэнту аб ходзе рэфармавання названага ведамства.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У Беларусі павялічваецца нараджальнасць у горадзе і на вёсцы

У Беларусі за студзень—жнівень гэтага года нарадзілася 69 тыс. 247 дзяцей. Гэта на 9,1 працэнта больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанаселніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Тацяна Шаметавец. Яна адзначыла, што найбольшы прырост колькасці нараджэнняў адзначаецца ў Брэсцкай вобласці (11,6 працэнта), у Мінску (10,4 працэнта) і ў Гомельскай вобласці (10 працэнтаў).

Так, сярод гарадскога насельніцтва рэспублікі колькасць народжаных у студзені—жніўні 2007 года ўзрасла на 10,2 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года, сярод сельскага — на 6,2 працэнта. Найбольшы ўсплёск нараджальнасці адзначаецца ў гарадскіх паселішчах Брэсцкай вобласці (14,3 працэнта), а таксама Магілёўскай і Гомельскай абласцей (па 11,3 працэнта). Сярод сельскіх паселішчаў найбольш аптымістычная сітуацыя склалася ў Мінскай вобласці — колькасць немаўлят узрасла на 10,3 працэнта. А вось у сельскіх паселішчах Магілёўскай вобласці колькасць нованароджаных зменшылася ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 2,1 працэнта. У цэлым па рэспубліцы агульны каэфіцыент нараджальнасці ў студзені—жніўні гэтага года склаў 10,7 на 1000 жыхароў. Гэты паказчык у Брэсцкай вобласці максімальны — 11,8, у Віцебскай вобласці мінімальны — 9,4.

За студзень—жнівень гэтага года памерлі амаль 89,8 тыс. чалавек, што складае 96,6 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года.

За восем месяцаў у рэспубліку прыбылі 9 тыс. 131 чалавек, выбылі 6 тыс. 82 чалавекі. Міграцыйны прырост склаў 3 тыс. 49 чалавек.

Колькасць насельніцтва Беларусі на 1 верасня — 9 млн 697 тыс. чалавек.

ЖНІВЕНЬ — «ШЛЮБНЫ», МАЙ — «РАЗВОДНЫ»

У Беларусі сёлета жнівень стаў самым «шлюбным» месяцам. Устаноўлены рэкорд па колькасці створаных сямейных пар — іх зарэгістравана 11 816. На другім месцы — ліпень (10 367 шлюбаў). За восем месяцаў марш Мендэльсона прагучаў для 52 914 пар (гэта на 7 працэнтаў больш у параўнанні з мінулым годам). Найбольшы прырост колькасці рэгістрацый шлюбаў адзначаны ў Магілёўскай і Гродзенскай абласцях (10,1 і 9,4 працэнта адпаведна), найменшы — у Віцебскай вобласці (6,3 працэнта). Аднак калі ў студзені—жніўні мінулага года распалася 20 487 сямейных саюзаў, то ў студзені—жніўні сёлета — ужо 23 757 (на 16 працэнтаў больш). Дарэчы, статыстыка шлюбаў і разводаў пацвярджае дрэнную рэпутацыю мая: маўляў, у маі жаніцца — толькі мучыцца. І, магчыма, таму закаханыя не спяшаюцца звязваць сябе вузамі Гіменея ў гэтым месяцы (зарэгістравана ўсяго 2419 шлюбаў). А вось колькасць разводаў у маі «зашкальвае» — 3393.

Алена ПРУС, БЕЛТА.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сёмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання пачне сваю работу 2 кастрычніка 2007 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала). Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 кастрычніка 2007 года з 8.30 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

фота Анатоля КЛЕЦЬКА.

ПУШЧАНСКІЯ ТРАФЕІ

17 гадоў жывуць у вёсцы Хвойнік Пружанскага раёна Мікалай і Наталля БУЛАТОЎСКІЯ (на фотаздымку). Не так даўно Мікалай узначаліў егерскую службу Хвойніцкага лясніцтва Белавежскай пушчы. Ёсць у яго і грамадская пасада вясковага старасты. Хаты многіх хвойніцкіх жыхароў упрыгожваюць кампазіцыі з аленевых рагоў. Адной з найбольшых калекцый валодаюць Мікалай і Наталля Булатоўскія. У вольны час яны з ахвотай адпраўляюцца на пошукі ўнікальных прыродных экспанатаў.

У Беларусі з удзелам банкаўскай Групы UniCredit рэалізавана некалькі паспяховых праектаў

Аб гэтым паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з прадстаўнікамі Міжнароднага Маскоўскага Банка, Групы UniCredit і банка Аўстрыя Крэдыта-нштальт АГ.

«З банкам UniCredit у Беларусі складваецца добры крэдытны партфель», — сказаў Сяргей Сідорскі. У якасці прыкладу паспяховага супрацоўніцтва ён прывёў праект рэканструкцыі «Магілёўхімвалакно», удзел у крэдытаванні якога прымала гэта банкаўская група.

UniCredit мае намер і ў далейшым інвеставаць у розныя сферы эканомікі Беларусі, у прыватнасці, размова ідзе аб праектах мікракрэдытавання.

Акрамя таго, Сяргей Сідорскі адзначыў, што развіццю адносінаў з Групай UniCredit будзе садзейнічаць работа адкрытага ўчора ў Мінску прадстаўніцтва Міжнароднага Маскоўскага Банка, які ўваходзіць у еўрапейскую банкаўскую Групу UniCredit.

БЕЛТА.

Да 2010 года восем тэлепраграм — у лічбавым фармаце

Як паведаміў на калегіі Міністэрства інфармацыі намеснік міністра інфармацыі Аляксандр Слабадчук, прапануецца зацвердзіць наступныя тэлепраграмы : «Першы канал» (Белтэлерадыёкампанія); «Лад» (Белтэлерадыёкампанія); «АНТ» (ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал»); «СТБ» (ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне»); «Расія»; «НТБ — Беларусь»; «Першы музычны канал» (ТАА «Дабрабачанне»); «Мір» (Прадстаўніцтва МТРК «Мір» у Рэспубліцы Беларусь).

У Беларусі вызначаны напрамкі спадарожнікавага вяшчання. Цяпер патэнцыяльная аўдыторыя вяшчання складае прыкладна 110 млн тэлегледачоў у больш як 40 краінах. Агульная колькасць тэлегледачоў спадарожнікавага канала «Беларусь-ТБ» на гэты момант — 6 млн чалавек, яго рэтрансліруе 381 кабельны аператар у 13 дзяржавах.

БЕЛТА

У Беларусі тарыфы на паслугі ЖКГ да канца года не павысяцца

Аб гэтым заявіў на сустрэчы з журналістамі начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Аляксандр Літвін.

«Па росту тарыфаў гэты год закрыты, і мы да гэтай тэмы да канца года не вяртаемся, паколькі ўсе рэзервы ўжо выбраны», — адзначыў ён. З пачаткам ацяпляльнага сезона чаканая ўсярэдненая плата за жыллёва-камунальныя паслугі складзе за аднапакаёвую кватэру Br81,4 тыс. Летам за аднапакаёвую кватэру плацілі ў сярэднім Br49,7 тыс. Плата за двухпакаёвую кватэру зімой складзе Br122,2 тыс. (летам было Br74,6 тыс.), за трохпакаёвую — Br170 тыс. (летам было Br101,7 тыс.). Такім чынам, падкрэсліў Аляксандр Літвін, «мы будзем плаціць больш за кватэру толькі ў сувязі з атрыманнем цяпла».

Ён таксама адзначыў, што цяпер паслугі ЖКГ складаюць 8,8 працэнта ў агульным аб'ёме расходаў насельніцтва Беларусі. Яшчэ ў 2003 годзе гэты паказчык складаў 11,1 працэнта. А ў Германіі, напрыклад, ён дасягае 35 працэнтаў, у расійскіх рэгіёнах — у Ніжнім Ноўгарадзе 13,4 працэнта, у Хабараўску — 24,7 працэнта.

Міжнькамгас прапрацоўвае прапановы па льготнаму крэдытаванню капрамонту жылля. Аб гэтым заявіў на сустрэчы з журналістамі начальнік управлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Эдмунд Грышкевіч.

Ён адзначыў, што цяпер 55 працэнтаў затрат на капітальны рамонт забяспечваецца за кошт адлічэнняў грамадзян. Астатняе — сродкі ведамстваў і дзяржавы. «Гэты працэс можна было б паскорыць, калі б ЖБК, а таксама таварыствы ўласнікаў дамоў маглі разлічваць на льготныя крэдыты», — лічыць спецыяліст. Такія прапановы цяпер прапрацоўваюцца ў міністэрстве.

БЕЛТА.

Бяспечнае харчаванне

ЦІ МОЖНА ЕСЦІ ГЭТАЕ «Е»?

Шэраг харчовых дабавак абсалютна бяспечны для здароўя, аднак выключэнні ўсё ж такі бываюць. Як толькі ў той ці іншай «Е» выяўляюцца цёмныя бакі, на яе адразу ж накладваецца забарона. Ёсць і такія, чыя абсалютная віна пакуль не даказана.

Так, расійскія СМІ паведамляюць аб неспрыяльным уздзеянні асобных харчовых фарбавальнікаў (Е 102, Е 110, Е 122, Е 124, Е 129) і аднаго кансерванту (Е 211) на псіхіку дзяцей. Маўляў, да такой высновы прыйшлі англійскія даследчыкі. Паддоследнымі сталі каля 300 дзяцей ва ўзросце 3—4 гадоў. 70 працэнтаў з іх прадэманстравалі паслядоўжывання раствору з адным з фарбавальнікаў павышаную ўзбуджальнасць. Тым не менш, гэта не стала падставай для вылучэння дадатковых сродкаў для далейшага вывучэння праблемы. Вытворцы харчовых дабавак сцвярджаюць, што ўсе рэчывы, якія атрымалі код «Е», прайшлі неабходныя даследаванні.

Паводле ўстаноўленых у той жа Расіі дый у нашай краіне нормаў, пералік дазволеных харчовых дабавак досыць вялікі. Што ж датычыцца канкрэтных фарбавальнікаў, то вось якім чынам можна іх ахарактарызаваць: Е 102 шырока прымяняецца ў вытворчасці напояў, мясных прадуктаў, вэнджанай рыбы, соўсаў, кандытарскіх вырабаў, Е 110 — у шакаладных і апельсінавых напоях, супавых і дэсертных канцэнтратах, Е 124 — у мясных паштэтах і жэле і г.д. Акрамя менавіта гэтых фарбавальнікаў, ёсць шэраг іншых, якія могуць выклікаць у дзяцей гіперактыўнасць, павышаную ўзбудджальнасць, а таксама дрэнна пераносяцца астматыкамі і алергікамі. Тым не менш, памянёныя дабаўкі дазволены для выкарыстання, а значыць, прымяняюцца ў тых дозах, якія, на думку даследчыкаў, можна лічыць бяспечнымі.

Любая галіна харчовай прамысловасці — мяса- і рыбаперапрацоўчая, кандытарская, піваварная і лікёра-гарэлачная, хлебапякарная і іншыя — выкарыстоўвае дзесяткі і сотні найменняў харчовых дабавак. Многія з прадуктаў без прымянення харчовых дабавак проста не існавалі б. Хто б еў «Доктарскую» каўбасу, калі б яна была карычневага колеру (варанае мяса мае менавіта такую афарбоўку, а рыжы колер з'яўляецца дзякуючы нітрыту натрыю Е 250)? Для вытворчасці зефіру, мармеладу і цукерак «Птушынае малако» выкарыстоўваюць агар (Е 406) або пекціны (Е 440). Кісель вараць на крухмале (Е 1400), у смятанковае масла дадаюць у якасці антыакісляльнікаў каціноіды (бэта-каратін Е 160) і г.д. Пад харчовымі дабаўкамі разумеюць групу рэчываў прыроднага або штучнага паходжання, якія выкарыстоўваюцца для паляпшэння тэхналогіі, атрымання прадуктаў спецыялізаванага прызначэння, захавання ці надавання харчовым прадуктам неабходных вартасцяў, павышэння стабільнасці або паляпшэння арганалептычных вартасцяў.

У некаторых краінах, у тым ліку ў нашай і суседняй Расіі, больш жорсткія патрабаванні да дазіровак на асобныя віды дабавак, чым гэта рэкамендавана Міжнародным камітэтам экспертаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Так, у нашых краінах выкарыстоўваецца значна менш таго ж нітрыту натрыю, таму што за мяжой каўбасныя вырабы ўжываюцца не часта, а ў нашых краінах яны лічацца паўсядзённым прадуктам.

Многія апасаюцца, што харчовыя дабаўкі спрыяюць развіццю захворванняў, у тым ліку страўніка-кішачнага тракта. Аднак у шэрагу эканамічна развітых краін дабаўкі выкарыстоўваюцца значна часцей і ў большым асартыменце, а захваральнасць намнога ніжэйшая, чым у нас. Наогул у свеце прымяняецца каля 500 найменняў розных рэчываў, а ў нас дазволена да прымянення значна менш.

Хімічныя назвы харчовых дабавак часта вельмі велізарныя і цяжкія для вымаўлення. Акрамя таго, у розных краінах яны могуць мець розныя назвы. Таму і была распрацавана міжнародная сістэма лічбавай кадыфікацыі. Літара «Е» азначае «Еўропа». Код, які пачынаецца на 1 азначае фарбавальнікі, 2 — кансерванты, 3 — антыакісляльнікі, 4 — стабілізатары, 5 — эмульгатары, 6 — узмацняльнікі смаку і водару, 9 — супрацьпенныя рэчывы. Індэксы з чатырохзначным нумарам гаворадь аб наяўнасці падсаладжвальнікаў, якія захоўваюць рассыпістасць цукру ці солі. Калі мы бачым на ўпакоўцы канкрэтнае рэчыва пад кодавай назвай, то перш за ўсё варта мець на ўвазе, што яно праверана на бяспеку.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

Ад каўбаскі разумным станеш!

Як паведаміла дырэктар навукова-тэхнічнага цэнтра Паўночна-Каўказскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта (ПКДТУ) Наталля Лук'янчанка, студэнт першага курса ўніверсітэта вынайшаў спосаб вырабу каўбасы, якая ўзмацняе працэс разумовай дзейнасці. «Адзін з інгрэдыентаў каўбасы — прарошчаныя зярняты нуту, які змяшчае селен. Апошні, як вядома, садзейнічае паляпшэнню разумовай дзейнасці», — патлумачыла суразмоўца. Доследная партыя такой каўбасы ў аб'ёме 30 кг была выпушчана на мясцовым мясакамбінаце і потым з'едзена самімі студэнтамі.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ — 10 ПРАЦЭНТАЎ

З 1 кастрычніка стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка Беларусі будзе зніжана на 0,25 працэнтнага пункта, паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік упраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Анатоль Драздоў.

Адпаведнае рашэнне прынята праўленнем Нацбанка. Такім чынам, з пачатку наступнага тыдня ўзровень стаўкі рэфінансавання будзе складаць 10 працэнтаў гадавых. Папярэдняе зніжэнне стаўкі на 0,25 працэнтнага пункта было праведзена 1 верасня. Нагадаем, што ў адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі прадугледжваецца, што да канца гэтага года стаўка рэфінансавання павінна скласці 7—9 працэнтаў гадавых.

Ігар ГРЫШЫН.

БУДЗЕМ ПІЦЬ БАРЖОМІ?

Упаўне магчыма. Не сёння і не заўтра, а ў будучыні. Пытанне стаіць у сувязі з тым, што ў Нараўлянскім раёне маюцца залежы мінеральнай вады, якая па сваіх уласцівасцях нагадвае славутую грузінскую баржомі. Дэпартаменту па геалогіі даручана вывучыць усе вартасці праекта.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ХАБАР, ЯКОГА НЕ БЫЛО

31-гадовы індывідуальны прадпрымальнік з Брэста, наабяцаўшы цэлы мех зямлячцы, прысвоіў грошы даверлівай дзяўчыны.

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, прайдзісвет, у прыватнасці, выклікаўся вырашыць жыллёвую праблему 23-гадовай брастаўчанкі — дапамагчы з выдзяленнем кватэры яе сям'і. Аднак, каб справа зрушылася з месца, прапанаваў «здобрыць» адказных асобаў адміністрацыі аднаго з раёнаў горада хабарам: маўляў, у такім выпадку ўсе праблемы ўдасца абысці. Прасцячка пагадзілася і перадала хітруну тры мільёны рублёў, якія апошні і не збіраўся нікому аддаваць, а паклаў ва ўласную кішэню. Пракуратурай вобласці ў дачыненні да прадпрымальніка ўзбуджана крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

КІНУЎ АЎТО З ТКАНІНАЙ НА 110 МЛН

Пры патруляванні зон пагранічнага кантролю ў пасёлку Мухавец Брэсцкай вобласці праваахоўнікамі быў затрыманы аўтамабіль «Форд-Транзіт» з кантрабандным таварам на агульную суму 110 млн рублёў.

Вадзіцель, дарэчы, убачыўшы, што справа дрэнь, знік з месца здарэння. Як высветлілася, у аўтамабілі перавозілася 86 рулонаў замежнай тканіны, на якую адсутнічалі дакументы.

Ігар ГРЫШЫН.

АДЗІНОКІЯ, АЛЕ НЕ ЗАБЫТЫЯ

У наступным месяцы старэйшае пакаленне чакае «Клопату».

На працягу кастрычніка ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа правядзе дабрачынную акцыю «Клопат» па аказанню дапамогі адзінокім і адзінока пражываючым пажылым людзям, інвалідам сталага ўзросту, грамадзянам, якія маюць патрэбу ў доглядзе, малазабяспечаным пенсіянерам, бяздомным. Валанцёры Чырвонага Крыжа арганізуюць збор і раздачу прадуктаў харчавання, у тым ліку гародніны, а таксама цёплага адзення, сродкаў асабістай гігіены, дапамогуць у правядзенні дробнага рамонту жылля.

Арганізацыі, фірмы, прадпрыемствы, гаспадаркі, грамадскія аб'яднанні і асобныя грамадзяне маюць магчымасць працягнуць руку дапамогі сваім суайчыннікам. Званіце, калі ласка, у сакратарыят Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа: **(017) 227 66 82, 227 14 17.**

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЗУБР САПРАЎДЫ ЁСЦЬ. АЛЕ ЁН НЕ АГРЭСІЎНЫ

Нядаўна сродкі масавай інфармацыі распаўсюдзілі навіну: быццам бы падчас уборкі буракоў у СВК «Доцішкі» Воранаўскага раёна зубр разагнаў брыгаду паляводаў, а механізатара прымусіў ціхенька прасядзець у кабіне камбайна тры гадзіны. Жывёліна, гаварылася, нават тройчы «спрабавала» на рогі ўборачную машыну. Паеўшы буракоў, волат накіраваўся па сваіх справах і толькі пасля гэтага сельскагаспадарчыя работы былі працягнуты.

Насамрэч, як даведалася «Звязда», усё было не зусім так. Сапраўды, зубр у гэтых мясцінах з'явіўся. У мінулыя выхадныя, напрыклад, калі людзі ўбіралі на ўчастках бульбу, ён «прагульваўся» ў межах бачнасці, нават падыходзіў да статку кароў, але нейкіх нязручнасцяў ад яго не было. У дыспетчарскай СВК якраз знаходзілася жанчына, якой згаданы механізатар даводзіўся сваяком. «Ён літаральна ў шоку, бо нічога такога не было, а з яго ўсе смяюцца, маўляў, гэта ж трэба, тры гадзіны ціхенька прасядзеў у кабіне. Яна ж на вышыні знаходзіцца, ды і што зубр мог зрабіць кажа, кажа, я ж жывёлу нават у вочы не бачыў». Галоўны аграном гаспадаркі Анатоль Міхневіч таксама пацвердзіў, што зубр не перашкаджаў уборачным работам, ды і іншых эканамічных страт ад яго няма. «Ён бацвінне ад буракоў есць, крышачку кукурузы. Ніякай агрэсіі не праяўляе, людзі падыходзілі да яго метраў на 50, жывёла была спакойнай. Адным часам ён да статку кароў фактычна быў прыбіўся...».

Паводле слоў дзяржінспектара Лідскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету (Воранаўскі раён падпадае ў сферу яе дзейнасці) Аляксандра Шокаля, пра зубра і тым больш нейкія патравы сельскагаспадарчых культур на тэрыторыі СВК «Доцішкі» ён нічога не чуў. Хоць літаральна ў аўторак аб'ехаў увесь раён і меў гутарку з першым намеснікам старшыні райвыканкама. У прыняцыпе Аляксандр Збігневіч не бачыць нічога дзіўнага ў з'яўленні ляснога волата ў гэтых мясцінах: «Гаспадарка «Доцішкі» размешчана літаральна на самай мяжы з Літвой, з тамтэйшай пушчай. Шмат дзе мяжа праходзіць нават па азёрах. Хутчэй за ўсё, гэта жывёла адтуль».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЧАКАЦЬ СУСЕДЗЯЎ ЦІ ШВЕЙЦАРЦАЎ?

Паводле жараб'ёўкі розыгрышу Кубка Дэвіса ў Лондане, у наступным сезоне нацыянальная мужчынская зборная Беларусі згуляе ў другім раўндзе 1-й Еўра-Афрыканскай групы з пераможцай пары Швейцарыя — Польшча (фаварыты тут швейцарцы). Матчы пройдуць 11—13 красавіка.

Вынік жараб'ёўкі карэспандэнт «Звязды» папрасіла пракаментаваць капітана зборнай Беларусі Дзмітрыя Татура:

— Хто для нас больш зручны, сказаць адразу нельга, бо Польшча — добрая каманда прыкладна такога ж узроўню, як і наша. Што ж датычыцца швейцарскай зборнай, то калі да нас прыедзе Федэрэр, гэта стане добрым падарункам для ўсіх беларускіх аматараў тэніса, але для нашых гульцоў будзе вялікім выпрабаваннем, бо ён — найманчэйшы тэнісіст планеты, першая ракетка свету.

ГУЧНАЯ ПЕРАМОГА АЗАРАНКІ

Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка здолела выйграць у прадстаўніцы першай дзесяткі сусветнага рэйтынгу — гэта восьмая ракетка планеты Надзея Петрова. У Люксембургу мінчанка перамагла расіянку меней чым за гадзіну — 6:2, 6:1.

Ірына ПРЫМАК.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КАЗАХСТАН ЗАПАТРАБУЕ АД РАСІІ КАМПЕНСАЦЫЮ ЗА ПАДЗЕННЕ РАКЕТЫ

Улады Казахстана ацанілі ўрон ад падзення расійскай ракеты «Пратон-М» на тэрыторыі рэспублікі.

Паводле папярэдніх разлікаў, памер кампенсацыі, якую мае намер запатрабаваць рэспубліка, складзе больш за мільярд тэнге (больш як 8,2 млн долараў).

ЧАРНАМЫРДЗІН УВЯЗАЎ ЦАНУ НА ГАЗ ДЛЯ УКРАІНЫ З ВЫНІКАМІ ВЫБАРАЎ У РАДУ?



Пасол РФ ва Украіне Віктар Чарнамырдзін лічыць, што цана расійскага газу для ўкраінскіх спажыўцоў будзе залежаць ад новага складу кабінета міністраў гэтай краіны.

Раней некаторыя ўкраінскія СМІ паведамілі, што Расія мае намер узняць цану на газ для Украіны на 7—10 працэнтаў. Зараз яна складае 130 долараў за тысячу кубаметраў. Чарнамырдзін адмовіўся напрамую звязваць вынікі парламенцкіх выбараў з цэнамі на газ, аднак адзначыў, што «ўсё будзе залежаць ад таго, які ўрад прыйдзе і як ён будзе весці гэтыя перамовы». Між тым, як вядома, урад ва Украіне будзе сфарміраваны менавіта пераможцамі выбараў у Вярхоўную Раду.

ПЕНТАГОН: 190 МЛРД НА ДЗВЕ ВАЙНЫ

Пентагон папрасіў Белы дом выдаткаваць 190 мільярдаў долараў на фінансаванне вайны ў Іраку і Афганістане ў 2008 годзе.

Ваенны бюджэт ЗША 2008 года стане самым вялікім з пачатку ўварвання амерыканскіх войскаў у Ірак. З верасня 2001 года ваенныя выдаткі ЗША перавысілі 600 млрд долараў.

У М'ЯНМЕ — МАСАВЫЯ ПРАТЭСТЫ

У чацвер іх цэнтрам стаў буйнейшы горад краіны Янгон. На вуліцы выйшлі да 70 тысяч маніфестантаў — нягледзячы на пагрозы ўладаў страляць у любога, хто ўдзельнічае ў акцыях пратэсту.

Паводле некаторай інфармацыі, стрэлы ўсё ж прагучалі — салдаты стралялі паверх галоў дэманстрантаў, каб разагнаць натоўп. Сілы бяспекі выкарысталі зброю пасля таго, як удзельнікі антыўрадавага пратэсту пачалі закідваць каменнем і пустымі бутэлькамі паліцэйскія грузавікі. Сярод удзельнікаў акцыі сведкі адзначылі каля тысячы будыйскіх манахаў. Мінулай ноччу сілы бяспекі краіны правялі рэйд па манастырах, падчас якога, паводле розных інфармацыі, былі арыштаваны ад 200 да 500 манахаў, якіх улады абвінавачваюць у арганізацыі масавых выступленняў.

Калі вярстаўся нумар, сталі прыходзіць паведамленні аб забітых і параненых у ходзе акцыі пратэсту. Сярод загінулых — японскі рэпарцёр. Яго смерць пацвердзіла МЗС Японіі. Прычыны гібелі людзей не ўдакладняліся, аднак, згодна з заявамі сведак, прычынай стаў менавіта агонь ваенных. Нагадаем, у сераду ад рук ваенных загінула восем мірных жыхароў, у тым ліку пяць будыйскіх манахаў.

МІЛІЦЫЯНЕРЫ НАКАСІЛІ 40 ТОН КАНАПЕЛЬ

У Луганскай вобласці супрацоўнікі праваахоўных органаў знайшлі нелегальныя пасевы канапель, плошча якіх перавышае 40 гектараў.

Для таго каб сабраць ураджай агульнай вагой 40 тон, міліцыянерам давялося выклікаць камбайны. Сёлета ва Украіне ўжо сабрана 70 тон канапель.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.09.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 149,00
1 еўра	3 038,58
1 латвійскі лат	4 304,89
1 літоўскі літ	880,09
1 чэшская крона	110,04
1 польскі злоты	803,73
1 расійскі рубель	86,09
1 украінская грыўня	426,28

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,9619
10 UAH	49,5886
1000 BYR	11,6037
EUR	35,3261

Курс у гандлёвых кампаніях (на 27.09.2007 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісьгся на часопіс «Главный бухгалтер. ГЗ» на 2007 год у радзецкі та самай выгаднай цане. Тэлефон радзецкі: 209-6901.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА В ОАО "БЕЛОРУССКАЯ ВАЛЮТНО-ФОНДОВАЯ БИРЖА"

Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь извещает о проведении 30 ноября 2007 г. в ОАО "Белорусская валютно-фондовая биржа" аукциона по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций открытого акционерного общества "АТЭП-5".

Продавец — Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь. Уведомление о проведении аукциона будет размещено на Интернет-сайте ОАО "Белорусская валютно-фондовая биржа" **(www.bcse.by)**.

КОНТАКТНЫЕ ТЕЛЕФОНЫ:

Фонд государственного имущества Госкомимущества — (017) 2848936, 2848562;
ОАО "Белорусская валютно-фондовая биржа" — (017) 2063468, 2063474;
Департамент ценовой политики Минэкономики — (017) 2006845, 2226717.

Информация о предлагаемых для продажи на аукционе акциях ОАО "АТЭП-5"

№	Полное и сокращенное наименование открытого акционерного общества, адрес	Уставный фонд, шт. акций	Номинальная стоимость акции, руб.	В распоряжении Госкомимущества		Предлагается для реализации		Стартовая цена одной акции, рублей	Информация о владельцах крупных пакетов акций (10 и более процентов)
				кол-во акций, шт.	в % к уставному фонду	кол-во акций, шт.	в % к уставному фонду		
1	Открытое акционерное общество "АТЭП-5" (ОАО "АТЭП-5"), г. Минск, ул. Асаналиева, 4-а	197981	132	2994	1,5	2994	1,5	134365	Одно физическое лицо (13,75 % уставного фонда)

Информация о находящихся в пользовании ОАО "АТЭП-5" земельных участках: г. Минск — 8,808 га, г. Молодечно — 0,8686 га, г. Слуцк — 2,2626 га, Минская обл. — 4,5504 га.

Еўрапейскія краіны заклікаюць Беларусь ратыфікаваць дагавор да Энергетычнай Хартыі

Аб гэтым заявіў генеральны сакратар Сакратарыята Энергетычнай хартыі Андрэ Мернье на сустрэчы з першым віцэ-прэм'ерам Беларусі Уладзімірам Сямашкам.

«Беларусь заўсёды з'яўлялася актыўным членам Энергетычнай Хартыі. Ратыфікацыя была б выгадна для Беларусі», — лічыць ён.

Андрэ Мернье таксама адзначыў, што Беларусь адыгрывае важную ролю як транзітная краіна. Пытанні транзіту з'яўляюцца актуальнымі для іншых краін — членаў Энергетычнай Хартыі. Ёсць яшчэ шмат праблемных пытанняў, якія трэба вырашаць разам.

У сваю чаргу Уладзімір Сямашка паведаміў, што Беларусь гатова абмяркоўваць і знаходзіць узаемапрымальныя рашэнні, якія будуць садзейнічаць інтэграцыі Беларусі ў сусветную эканоміку і ўзмоцняць гарантыі энергабяспекі краіны.

У Сусветны дзень турызму Мінспорту і турызму Беларусі аб'явіла турыстычны марафон «Пазнай Беларусь»

У Сусветны дзень турызму, які штогод адзначаецца 27 верасня па рашэнню Генеральнай асамблеі Сусветнай турысцкай арганізацыі, Міністэрствам спорту і турызму Беларусі аб'яўляецца турыстычны марафон «Пазнай Беларусь». Аб гэтым паведамілі ў аддзеле планавання і арганізацыі турыстычнай дзейнасці дэпартамента па турызму Міністэрства спорту і турызму Беларусі.

Мэта марафону — прыцягнуць беларускіх грамадзян да больш актыўнага наведвання знакавых турыстычных аб'ектаў, помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны рэспублікі. Прыняць удзел у акцыі з 27 верасня па кастрычнік 2008 года зможа любы беларус — для гэтага ў Мінспорту і турызму склалі спіс асноўных выдатных мясцін рэспублікі, куды ўвайшло больш як 100 аб'ектаў. Наведваючы той або іншы аб'ект, грамадзянін зможа пакінуць кароткі запіс у спецыяльнай кніжцы турыста для ўдзельнікаў марафону. Акрамя таго, своеасаблівым доказам наведвання выдатных мясцін стане і памятны фотаздымак турыста. У каго такіх матэрыялаў за год набярэцца больш, той і стане пераможцам турыстычнага марафону «Пазнай Беларусь».

Каардынатарам марафону з'яўляецца Нацыянальнае агенцтва па турызму, куды і трэба будзе прысылаць усе матэрыялы (або ў абласныя філіялы агенцтва).

У дэпартаменце па турызму галіновага ведамства адзначылі, што канчатковае падвядзенне вынікаў акцыі, а таксама ўзнагароджванне пераможцаў адбудзецца восенню будучага года ў рамках штогадовага Рэспубліканскага турысцкага конкурсу «Пазнай Беларусь».

БЕЛТА.

З сярэдзіны кастрычніка пачнецца прышчэпачная кампанія супраць грыпу

Для спецыфічнай прафілактыкі грыпу ў Беларусі ў гэтым годзе Міністэрства аховы здароўя закупіць 596 тыс. доз інактываванай грыпознай вакцыны для дарослых і 310 тыс. доз для дзяцей. Уся вакцына расійскай вытворчасці. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка Шымановіч.

Паводле яе слоў, хутка паступіць першая партыя вакцыны, а прыкладна з сярэдзіны кастрычніка пачнецца прышчэпачная кампанія супраць грыпу.

Бясплатнай імунізацыі падлягаюць асобы, якія адносяцца да групы высокай рызыкі неспрыяльных наступстваў захворвання на грып. Гэта людзі з хранічнымі захворваннямі дыхальнай, сардэчна-сасудзістай і эндакрыннай сістэм, з парушэннямі функцыі нырак або гемаглабінапатыямі, з імунадэфіцытам (у тым ліку ВІЧ-інфіцыраваныя і тыя, хто праходзіць імунасупрэсіўную тэрапію), дзеці старэйшыя за 6 месяцаў і падлеткі на працяглай аспірынатэрапіі, людзі старэйшыя за 65 гадоў. Бясплатныя прышчэпкі будуць таксама рабіцца грамадзянам, якія з-за сваёй прафесіі маюць вялікую рызыку захворэць на грып. Да іх адносяцца медыкі, работнікі дамоў дзіцяці і дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў, птушкаперапрацоўчых прадпрыемстваў, спецыялісты ветэрынарнай сферы і арнітолагі.

Вакцынацыя проціпаказана людзям, якія мелі алергічныя рэакцыі на папярэднія прышчэпкі грыпознай вакцыны або на курыны бялок, сістэмныя дыфузныя захворванні злучальнай тканкі, захворванні надныракавікаў, спадчынныя, дэгенератыўныя і прагрэдыентныя захворванні нервовай сістэмы. Тым, хто хварэе на вострыя інфекцыйныя і неінфекцыйныя, а таксама хранічныя захворванні ў стадыі абвастрэння, прышчэпкі можна рабіць толькі праз месяц пасля выздараўлення.

Вераніка Шымановіч адзначыла, што эпідэмія грыпу ў Беларусі пакуль чакаецца ў характэрныя для рэспублікі тэрмінах: канец студзеня—пачатак лютага наступнага года.

СЧИТАТЬ УТЕРЯННЫМИ СТРАХОВЫЕ ПОЛИСЫ ЗСАО «БРОЛЛИ»:

— Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ № 0490686, 0505190, 0523975, 0523983—0523986, 0523988—0523997, 0601098—0601101, 0601109—0601110, 0610436, 0611474, 0611480, 0611482—0611484, 0611491, 0614863—0614864, 0614868, 0614876, 0614882, 0614888, 0618885, 0618897, 0618904, 0705780, 0705784—0705786.

— Квитанция 1-СУ серия ГС № 5377919, 5372687.

— Добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско) (ф.2РН, 2РП) серия АК № 0006137.

— Добровольное страхование от несчастных случаев (ф.2РН, 2РП) серия БИ № 0003151.

— Добровольное страхование имущества предприятий и организаций, добровольное страхование финансовых рисков, добровольное страхование рисков непогашения кредитов, добровольное страхование ценностей касс, добровольное страхование строительно-монтажных рисков ф.2РП серия БИ № 0000187.

— Добровольное страхование грузов ф.2РП серия БИ № 0001379, 0001384.

Прамая лінія

МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА. ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

На пытанні чытачоў «Звязды» адказвае начальнік упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Ігар Уладзіміравіч БРОЎКА

(Працяг. Пачатак у нумары за 27 верасня.)

☎ Леанід ПАТАПЕНКА, Баранавіцкі раён:

— З якой перыядычнасцю мабільныя брыгады спецыялістаў-медыкаў з раённага цэнтра павінны наведваць глыбінку? Гэта вельмі зручная форма медыцынскага абслугоўвання, хацелася б, каб яе выкарыстоўвалі часцей.

— Перыядычнасць выездаў спецыялістаў у складзе мабільных брыгад у адданеныя раёны ажыццяўляецца ў планавым парадку, у адпаведнасці са спецыяльнымі графікамі. Больш канкрэтна і дэталёва аб'ёмы такой работы вызначаюцца кіраўнікамі арганізацый аховы здароўя (галоўнымі ўрачамі раёнаў) у адпаведнасці з асаблівасцямі той ці іншай тэрыторыі і патрэбай насельніцтва ў спецыялізаваных відах дапамогі.

☎ Ірына НІКАЛАЕВА, г. Мінск:

— Якія функцыі маюць даўрачэбныя кабінеты ў паліклініках, ці можна там афарміць бальнічны? І яшчэ мяне цікавіць такое пытанне: наколькі сур'ёзна праводзяцца медыцынскія агляды школьнікаў?

— Асноўная задача даўрачэбных кабінетаў — правядзенне апытання пацыентаў, гэта робіцца з тым, каб вызначыць дакладны «алгарытм» далейшых дзеянняў. Тут можна праверыць артэрыяльны ціск, памераць тэмпературу і інш. У асобныя перыяды (напрыклад, падчас эпідэміі грыпу) на гэтыя падраздзяленні ўскладзены і функцыі афармлення лісткоў часовай непрацаздольнасці. А што датычыцца аглядаў, то іх школьнікі праходзяць двойчы ў год — вясной і ўвосень. Падчас такіх абследаванняў урачы акцэнтуюць увагу на тых дзецях, у якіх маюцца хранічныя захворванні. Зразумела, пры гэтым сур'ёзна аглядаюцца ўсе школьнікі, існуе пэўны парадак правядзення такіх медыцынскіх абследаванняў — праверка зроку, магчымых парушэнняў постаці, страўнікава-кішачнага тракту і інш. Акцэнт робіцца менавіта на тых адхіленнях стану здароўя, якія часцей за ўсё здараюцца сярод дзяцей школьнага ўзросту. Калі іх нешта непакоіць, то ўрач абавязкова вывучыць прычыну і накіруе на больш дакладнае вывучэнне сітуацыі на прыём у патрэбную медыцынскую ўстанову. Тут павінна быць актыўная пазіцыя і ў бацькоў — каб дзеці не сароміліся казаць аб сваіх праблемах са здароўем.

☎ Зінаіда Юр'еўна ЧАРТАПАЛАВА, г. Барысаў:

— Раней чытала ў газеце, што чакаецца сертыфікацыя айчынных санаторыяў, з якіх павінны застацца толькі тыя, дзе праводзіцца сапраўднае лячэнне, астатнія зменяць статус. Ці праводзіцца такая работа, якія яе вынікі?

— У мэтах удасканалення адпаведнай сістэмы 28 жніўня 2006 года быў прыняты Указ кіраўніка дзяржавы «Аб санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні». У адпаведнасці з гэтым дакументам летась праведзена атэстацыя ўсіх санаторна-курортных устаноў. Хачу вам паведаміць, Зінаіда Юр'еўна, што 31 мая 2007 г. пастановай Міністэрства аховы здароўя зацверджаны пералік санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый, куды з выкарыстаннем сродкаў сацыяльнага страхавання і рэспубліканскага бюджэту грамадзяне могуць быць накіраваны на аздараўленне.

☎ Аляксандр, г. Мінск:

— Маёй маці 73 гады, у яе даўнія праблемы з суставамі. Працягваецца гэта ўжо амаль 40 гадоў. Паўстала пытанне аб тым, што трэба рабіць аперацыю па замене каленнага сустава, аднак урачы папярэдзілі: могуць быць проціпаказанні хірургічнаму ўмяшанню. Што тут можна параіць, магчыма, ёсць спецыялізаваныя санаторыі, дзе дапамагаюць у такім выпадку?

— Аляксандр, заўважу адразу: санаторна-курортнае лячэнне ў такім выпадку наўрад ці дапаможа вылечыць захворванне ці пазбавіцца ад болю. Я параіў бы вашай маці звярнуцца ў інстытут траўматалогіі і артапедыі да загадчыка аддзялення каленнага сустава. Там ёй дапамогуць кваліфікаваныя спецыялісты. Пры падрыхтоўцы да аперацыі заўсёды праводзіцца абследаванне, падчас якога вызначаюцца як паказанні, так і проціпаказанні да правядзення аператыўнага лячэння. Так што пасля таго, як звернецеся на кансультацыі ў інстытут, усё стане дакладна вядома і можна будзе вызначыць канкрэтную праграму далейшых дзеянняў.

☎ Леанід ВЕРАМЕЕЎ, Слаўгарадскі раён:

— У праграме адраджэння вёскі вядзецца гаворка і пра аднаўленне сацыяльнай сферы, у тым ліку гэта датычыцца і галіны аховы здароўя. Ці ўключаны медыцынскія работнікі ў пералік спецыялістаў, якія могуць прэтэндаваць на атрыманне службовага жылля — домікаў, што ўзводзяцца гаспадаркамі?

— Дзяржаўнай праграмай адраджэння вёскі ў тым ліку прадугледжана і развіццё медыцынскага забеспячэння сельскага насельніцтва, стварэнне амбулаторый агульнай практыкі, бальніц сястрынскага догляду, закупка санітарнага транспарту, медыцынскага абсталявання, апаратуры, сродкаў сувязі. Адным з пунктаў праграмы па замацаванню спецыялістаў у вёсцы вызначана і забеспячэнне медыцынскіх работнікаў добраўпарадкаваным жыллём, якое актыўна будуецца ў аграгарадках.

☎ Ева Дзмітрыеўна ПІСКУН, г. Жлобін:

— Як магчыма стрымаць рост новаўтварэнняў? Апошнія сем гадоў мяне гэтая праблема вельмі хвалюе, кансультавалася і з ЛОР-урачом, хірургам. Рабілі медыцынскае заключэнне — спецыялісты прызналі, што пухліны дабраякасныя. Але, тым не менш, яны перыядычна з'яўляюцца ў розных месцах цела...

— Паколькі рост новаўтварэнняў адбываецца сістэмна і вы ўжо кансультаваліся з ЛОР-урачом і з хірургам, то вам, Ева Дзмітрыеўна, трэба звярнуцца ў інстытут анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, які знаходзіцца ў Бараўлянах. Самае галоўнае цяпер пераканацца, што новаўтварэнні пасля не прывядуць да пагаршэння стану здароўя, не пяройдуць у злаякасныя. І ўвогуле неабходна дакладна разабрацца, што з вамі адбываецца. У інстытуце анкалогіі і медыцынскай радыялогіі ўсё гэта можна высветліць, там працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты. Накіраванне на абследаванне можна ўзяць па месцы жыхарства, а калі там па нейкіх прычынах адмовяць, то звяртайцеся прама ў Міністэрства аховы здароўя.

☎ Вольга АЛЯКСАНДРАВА, г. Мінск:

— У мяне трое дзяцей, ва ўсіх развіваецца блізарукасць. Больш-менш удалося яе спыніць, калі з'ездзілі ў санаторый пад Радашковічамі, які спецыялізуецца на паталогіях зроку. Але пасля не здолелі туды патрапіць — сказалі, што не маем права на льготныя пуцёўкі. Між тым, за свае грошы цяжка адправіць усіх дзяцей на лячэнне, а ўрачы раяць рабіць гэта два разы ў год. Як знайсці выйсце з сітуацыі?

— Адразу прапаную з усімі неабходнымі дакументамі пад'ехаць да галоўнага педыятра Міністэрства аховы здароўя, пасля кансультацый са спецыялістамі, якія курыруюць санаторна-курортнае лячэнне, вам акажуць канкрэтную дапамогу. Таксама варта звярнуцца па кансультацыю ў Рэспубліканскі дзіцячы афтальмалагічны цэнтр (ён размешчаны ў чацвёртай дзіцячай сталічнай бальніцы), пажадана там пастаянна быць пад медыцынскім наглядам.

Мікалай ЛІТВІНАЎ. Фота аўтара.

(Заканчэнне будзе.)

ЗВЯЗДА Радыё Рацыя

Алег СЛІЖЭЎСКІ: «Агульная колькасць грамадзян, якія з'яўляюцца членамі дзеючых шаснаццаці партый, не перавышае 75 тысяч»

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 27 верасня.)

Першы нацыянальны канал Беларускага радыё запрасіў у студыю начальніка ўпраўлення грамадскіх аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі Алега СЛІЖЭЎСКАГА. Разам з журналістам радыё пытанні ў прамым эфіры задаваў карэспандэнт «Звязды».

— Калі ж гаварыць пра лічбы колькасці членаў партый...

— Партыі нам паведамляюць аб сваёй колькасці, і гэта інфармацыя гаворыць пра тое, што амаль палова дзеючых партый мае колькасць ад 1000 да 1500 членаў. Такім чынам, не нашмат больш, чым заканадаўства мае патрабаванне да мінімальнай колькасці членаў партый. Аб нейкай больш-менш рэальнай падтрымцы з боку пэўных слаёў насельніцтва сёння могуць гаварыць толькі адзінкі сярод партый.

Аднак пра ступень папулярнасці (па колькасці членаў партыі) можна меркаваць толькі ў тым выпадку, калі заяўленая партыяй колькасць адпавядае сапраўднасці. Звесткі аб колькасці сваіх членаў партыі накіроўваюць Міністэрству юстыцыі самі і гаварыць пра іх сапраўднасць мы не можам. Практыка паказвае, што многія партыі завышаюць рэальную колькасць членаў, каб надаць значнасці ў вачах грамадства. Дакладную інфармацыю можа даць толькі праведзеная Міністэрствам юстыцыі праверка партыі. Такія плановыя праверкі мы праводзім.

Агульная ж колькасць грамадзян, якія з'яўляюцца членамі дзеючых шаснаццаці партый, не перавышае 75 тыс. Пры гэтым яшчэ раз падкрэслю, што гэтыя даныя могуць быць завышаныя, бо пададзены самімі партыямі.

— За што партыя можа атрымаць папярэджанне? Давайце разгледзім гэтае пытанне на прыкладзе шасці партый, якія нядаўна атрымалі папярэджанні Міністэрства юстыцыі.

— ...Калі партыя выходзіць за рамкі патрабаванняў заканадаўства, функцыя Міністэрства юстыцыі — указаць ёй на гэта. У выпадку нязначнага парушэння мы практыкуем простае напісанне пісьмаў у адрас партый, дзе гаворым, што маюцца парушэнні і прапануем іх ухіліць. Калі ёсць больш грубае парушэнне альбо не ліквідавана парушэнне, за якое выносілася вуснае папярэджанне альбо накіроўвалася звычайнае пісьмо, Міністэрства юстыцыі выносіць пісьмовае папярэджанне.

Закон гаворыць, што Міністэрства юстыцыі павінна ўказаць у пісьмовым папярэджанні падставы, па якіх яно вынесена, і даць тэрмін партыі для ўхілення парушэнняў. У 90 працэнтах выпадкаў мы даём месячны тэрмін. Вядома ж, мы глядзім на тое, які час аб'ектыўна патрабуецца на ўхіленне парушэнняў. І часам ён можа быць больш за месяц. За гэты тэрмін кіраўніцтва партыі павінна прыняць вычарпальныя меры, каб падвабіцца парушэнняў. І па сканчэнні вызначанага тэрміну ў Міністэрства юстыцыі павінны паступіць дакументы, якія пацвярджаюць гэта. Калі ж па суб'ектыўных прычынах партыя іх не ўхіляе, могуць быць прыменены больш сур'ёзныя меры адказнасці — такія, як прыпыненне дзейнасці партыі ці яе ліквідацыя ў судовым парадку.

Шасці партыям сапраўды ў жніўні былі вынесены пісьмовыя папярэджанні. Чаму? У лістападзе 2005 года быў прыняты ў новай рэдакцыі Закон «Аб палітычных партыях». У ім былі крыху павышаны патрабаванні да партый. Было вызначана, што партыі павінны мець абласныя арганізацыі ў большасці абласцей, а таксама Мінскую гарадскую. Ужо прайшло больш за 2 гады, але партыі не маюць патрэбнай колькасці абласных арганізацыйных структур. Хоць Міністэрства юстыцыі адразу пасля прыняцця закона напісала ў адрас усіх партый ліст, дзе паведаміла аб новых патрабаваннях закона. І прапаноўвалася прыняць меры, каб стварыць неабходную колькасць структур. Але ў вызначаны тэрмін яны створаны не былі, пасля чаго былі вынесены пісьмовыя папярэджанні. І гэтыя папярэджанні шасці партыям — паўторныя.

— У які тэрмін павінны згаданыя шэсць партый ліквідаваць парушэнні? Што мае намер рабіць Міністэрства юстыцыі ў адносінах да партый, калі парушэнні не будуць ліквідаваныя?

— Мы далі месячны тэрмін. Чакаем, што праз вызначаны час атрымаем рэальныя дакументы аб прынятых партыямі мерах. У выпадку, калі парушэнні не будуць выпраўлены, мы будзем вывучаць прычыны гэтага. Хоць, шчыра кажучы, мне цяжка сказаць, якія прычыны могуць быць важкімі. Бо больш за два гады — тэрмін больш чым дастатковы, каб стварыць такую колькасць аргструктур.

Так, мы чуем сёння ад некаторых партый, што яны маюць праблемы з пошукам памяшканняў. Але выбачайце, у партыі, як мінімум, тысяча членаў. У партыі павінны быць прыхільнікі. І знайсці крыху больш за 5 адрасоў, каб размясціць кіруючыя органы партрганізацый на ўсёй тэрыторыі рэспублікі... Тут няма жорсткага патрабавання, што памяшканне павінна быць дзяржаўнай формы ўласнасці. Любы «прыватнік» можа даць памяшканне. Магчыма, нават у бязвыплатнае карыстанне.

Таму я не сказаў бы, што існуе нейкая безвыходная сітуацыя. І калі патрабаванні не будуць выкананы, мы будзем разглядаць пытанне аб тым, якія меры прымаць далей.

— Ці не плануецца ў самы бліжэйшы час уносіць змяненні ў заканадаўства, якое датычыцца палітычных партый і грамадскіх арганізацый?

— Я не ведаю, каб сёння планаваліся нейкія прынцыповыя змяненні ў заканадаўстве аб дзейнасці партый ці іншых грамадскіх аб'яднанняў. Адзінае, зараз вядзецца праца над праектам Закона «Аб прафесійных саюзах». Дакумент ужо рыхтуецца да ўнясення ў парламент.

Падрыхтаваў Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Крымінал, здарэнні

ХАБАР НЕ ПРАЙШОЎ

Пракуратура Мінскай вобласці закончыла расследаванне і накіравала ў суд крымінальную справу ў адносінах да старшыні Каладзішчанскага сельскага выканкама Мінскага раёна.

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Генпракуратуры, старшыня Каладзішчанскага сельскага выканкама абвінавачваецца ў тым, што даваў незаконныя распараджэнні сакратару сельвыканкама аб складанні заведама падложных рашэнняў аб спыненні права карыстання грамадзянамі зямельнымі ўчасткамі. Таксама старшыня прымушаў грамадзян да ўнясення на разліковы рахунак сельвыканкама грашовых сродкаў без адпаведных законных падстаў.

Гэта не адзіны факт узбуджэння крымінальных спраў у дачыненні да службовых асобаў мясцовых выканаўчых органаў, якія дапускалі махінацыі з зямельнымі ўчасткамі. У прыватнасці, былы старшыня Ждановіцкага сельскага выканкама абвінавачваецца ў тым, што з перавышэннем улады і службовых паўнамоцтваў прымаў незаконныя рашэнні аб канфіскацыі раней выдзеленых зямельных участкаў у грамадзян і перадачы гэтых участкаў іншым карыстальнікам. 30 жніўня была ўзбуджана крымінальная справа і ў адносінах да былога старшыні Шчомыслiцкага сельвыканкама, які падлісаў заведама незаконныя рашэнні аб перадачы грамадзянам 36 зямельных участкаў.

Алег ЛІЦКЕВІЧ, БЕЛТА.

ЗДАЕШ КВАТЭРУ НА СУТКІ? СЦЕРАЖЫ МАЁМАСЦЬ!

У Мінску раскрыта злачынная група, якая ўчыняла крадзяжы шляхам знімання кватэр на суткі. Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік начальніка ўпраўлення крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама Мікалай Верам'ёў.

Злачынцы здымалі кватэру на суткі, і за гэты час выносілі ўсю маёмасць, аж да сантэхнікі і плінтусаў. Крымінальная групоўка складалася з трох чалавек. Іх знайшлі з дакозамі віны пры ўчыненні чарговага злачынства. Праўда, у час затрымання аднаму са зламыснікаў удалося ўцячы, адзначыў Мікалай Верам'ёў.

Уладзімір ВАСІЛЬКОЎ, БЕЛТА.

УЦЯКАЧ ЗБІЎ ВЕЛАСІПЕДЫСТА І ПЕШАХОДА...

У Барысаве вадзіцель, які спрабаваў знікнуць на аўтамабілі ад праваахоўнікаў, нарабіў бяды на адной з вуліц горада.

Папярэднічала ж гэтым падзеям аперацыя, якую праводзілі супрацоўнікі міліцыі з мэтай затрымання асобаў, якія займаюцца збытам наркатычных і псіхатропных рэчыў. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, каля дзвюх гадзін дня паблізу будаўнічага рынку ў Барысаве дзве службовыя машыны праваахоўнікаў заблакіравалі аўтамабіль «ВАЗ 2107», за рулём якога знаходзіўся 39-гадовы мясцовы жыхар. Апошнія, аднак, гэта зусім не збянтэжыла: уключыўшы заднюю перадачу, ён нацiснуў на газ — «Жыгулі» зламысніка наехалі на «Шкоду Актавію» пад кіраваннем супрацоўніка міліцыі і саравіліся далей з месца. Каб спыніць уцекача, аператыўнікі выкарысталі табельную зброю, але дзе там — вадзіцель імчаў далей. Праваахоўнікі вымушаны былі спыніць праследаванне, таму што на вуліцы быў інтэнсіўны рух. Што датычыцца вадзіцеля «Жыгулёў», то ён, нібы зламаўшы галаву, нёсся па дарозе, а на вуліцы Арджанікідзе не справіўся з кіраваннем і збіў веласіпедыста, які ехаў у спадарожным напрамку. Пасля гэтага машына выехала на тратуар, дзе пад яе колы трапіў яшчэ і пешаход, і перакулілася. Гэтым аднак справа не абмежавалася: куляючыся, аўто сутыкнулася з яшчэ адной машынай — «ГАЗ-3302-3», якая стаяла на праезнай частцы. Пешаход і пасажыр «ВАЗ 2107» атрымалі цялесныя пашкоджанні і былі змешчаны ў бальніцу, уцякач затрыманы і змешчаны ў ізалятар.

Ігар ГРЫШЫН.

НЕ МЕЎ ДАЗВОЛУ, НАВОШТА ПАЛЯВАЎ?

Работнікамі Браслаўскай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету складзены адміністрацыйны пратакол у дачыненні да работніка ТДА «Віоіл плюс», які ў паляўнічых угоддзях эксперыментальнай паляўнічай гаспадаркі «Браслаў» незаконна здабыў двух зайцаў і казулю.

У яго канфіскаваны тры паляўнічыя ружжы (наразное, гладкаствольнае і камбінаванае) і дзікчына агульнай вагой каля 12 кілаграмаў. Браслаўскім РАУС зараз разглядаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

А супрацоўнікі Бягомльскай міжрайінспекцыі затрымалі вартаўніка Докшыцкага райаграсэрвісу, які каля 20 гадзін паблізу вёскі Хілаўшчына Докшыцкага раёна без дазвольных дакументаў на права паляванне і з выкарыстаннем незарэгістраванага паляўнічага ружжа здабыў казулю. Канфіскаваная зброя перададзена ў мясцовы РАУС, туша казулі вагой каля 30 кілаграмаў здадзена ў ДВУ «Бярэзінскі біясферны запаведнік». Па гэтаму факту ўзбуджана крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

В связи с хищением страховых полисов по ОСАГО на территории РФ, **страхователям, заключившим договора страхования на переходе Звенчатка с «АЙНИ» серии ААА № 0407355604—0407355609, квитанций 1-су с № 5760268—5760273, просьба обратиться в СООО** «Белкоопстрах» в г. Могилеве (тел. 266274).

З юбілеем шчыра віншуем начальніка Хоцімскага вузла паштовай сувязі С. В. ФЕШЧАНКУ. Добрага здароўя Вам, шаноўны Сяргей Васільевіч, поспехаў у працы, заўсёднага ладу ў сям'і.

Звяздоўцы .

Па здароўе — на кірмаш

У Брэсце пачалася III Міжнародная выстава-кірмаш «Садзейнічанне здароваму ладу жыцця-2007».

Вытворцы медыцынскага абсталявання, тавараў для актыўнага адпачынку і спорту з Беларусі, Расіі, Польшчы, Румыніі пакажуць сваю прадукцыю. У час выставы будуць працаваць урачы розных профіляў. Наведвальнік мерапрыемства зможа бясплатна памераць узровень халестэрыну, цукру ў крыві, зрабіць ультрагукавую дыягностыку шчытападобнай залозы. Усім ахвотнікам памераюць ціск і дадуць карысныя парады. Мерапрыемства пройдзе ў спарткомплексе «Вікторыя», а на пляцоўках каля будынка адбудзецца спартыўнае свята.

Яна СВЕТАВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З ДУМКАМІ ПРА ЗІМУ

Майстар з вёскі Пакуцце Дрыбінскага раёна Уладзімір ЗЮЛІКАЎ навучыўся рабіць валёнкі ад свайго бацькі.

Усміхнёмся!

Псіхіятр — пацыенту:

— Такім чынам, кожную ноч вам сніцца нейкая жахлівая істота, якая кідаецца на вас, крычыць і б'е па галаве ўсім, што пад руку трапіць. Але, зразумела, калі вы прачынаецеся, гэта істота знікае?

— У тым і праблема, што не, доктар! Раніцай істота звычайна крычыць: «Хопіць дрыхнуць, лайдак, адвядзі дзяцей у дзіцячы садок!».

☺

Надпіс на аўтамабілі «Ака» ззаду: «Спяшаешся — перакоч ыш!».

☺

У тэхаскім салуне:

— Джо, ты, здаецца, зазнаўся?

— З чаго ты ўзяў?

— Учора я на цябе цэлую абойму патраціў, а ты нават не азірнуўся.

☺

На Камчатцы апошнюю парту называюць Калінінград.

☺

Падыходзіць мужык да суседскага плота, крычыць: «Эй, сусед!». Нікога. Грукае. Цішыня. Раптам з таго боку плота падыходзіць сабака і кажа:

— Ну, што шуміш? Бачыш, дома нікога няма?

Мужык страціў прытомнасць. Ачуняў — бачыць, над ім стаіць той жа сабака.

— Сабака, ты што, брахаць не ўмееш?

— Чаму, умею — проста палохаць цябе не хацеў...

☺

Муж з жонкай ідуць па вуліцы. Нейкі незнаёмы чалавек элегантна здымае капялюш і вітаецца.

Муж:

— Ты бачыла — які ветлівы?

— Ветлівы! Ты б ведаў, як ён храпе!

ВЫПІЎ, ЗАКУРЫЎ, ЗГАРЭЎ

Менавіта такімі вось вынікамі закончылася жыццё трох жыхароў Гомельшчыны. Пасля сваркі са сваёй сужыцелькай, якая пагнала карову ў статак, 43-гадовы мужчына з вёскі Бялёў Жыткавіцкага раёна, не затушыўшы «бычок», кінуў яго, а сам заснуў. Безумоўна, узнік пажар, і гаспадар дома стаў яго ахвярай. Дарэчы, летась у падобнай абстаноўцы яму ўдалося выратавацца.

«Чырвоны певень» даканаў і 42-гадовую жанчыну з вёскі Балотня Рагачоўскага раёна, якая была пазбаўлена бацькоўскіх правоў у адносінах да яе траіх дзяцей, што выхоўвала дзяржава. Тое ж самае здарылася і з мужчынам 1958 года нараджэння з вёскі Пакалюбічы Гомельскага раёна. Той жыў у хаце са сваім састарэлым бацькам, якога ў час пажару дома не было.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПЕРАД ВЫБАРАМ...

Валянцінкай

Развод цяпер рэч звыклая: вунь колькі іх... Не з цябе (свят-свят...) пачалося, не табой і скончыцца...

Але ж гэта так, калі ўвогуле.

А калі ў прыватнасці і не дзе-небудзь далёка, а побач...

Ёй тады гадоў 20 было — весялуха, прыгажунька, разумніца. А свет клінам сышоўся — на куды старэйшым за яе, на жанатым.

Ды ці ж гэта бяда (ёй здавалася), калі кахаеш... Так, як яна... Яго. І як ён... Яе...

Сустракаліся. Гадамі (хоць і гады ў рады) — на нейкіх здымных кватэрах, крадком. Ён тады засыпаў яе кветкамі, насіў на руках, кляўся-бажыўся, што кахае. І ёй (лепш жа каханне без шлюбу, чым шлюб без кахання?) гэтага было дастаткова.

Але... па першасці: пакуль сяброўкі адна за адной не сталі запрашаць на вяселлі, не сталі знаёміць са сваімі мужамі, не сталі, хто як мог, купляць-атрымліваць кватэры... А што найбалючай — не сталі нараджаць, не сталі паказваць ёй сваіх, такіх маленечкіх, такіх пацешных дачушак-сынкоў... Яны (нават не весялухі, не прыгажуні і не разумніцы) будавалі свае гнёзды, свае сем'і, свае жыцці...

У яе ж не было... Нічога. Нават перспектыў, бо заводзіць дзяцей «на баку» ён каханы катэгарычна адмаўляўся, разводзіцца з жонкай — таксама. Ён, гаварыў, чалавек абавязку...

І яна, стаміўшыся гэта слухаць, рашылася: сказала, што з яе хопіць — альбо-альбо.

Ён, як і варта было чакаць, выбраў другое: што значыць — не яе.

Перахварэла (у поўным сэнсе гэтага слова), перажыла. Нават замуж выйшла праз год за харошага хлопца, нарадзіла дачку. І, напэўна, спакойна жыла б, калі б...

Калі б той, каго так кахала, больш ніколі не званіў ёй, не казаў, што жыццё яго страціла сэнс, не плакаў, што не можа без яе, што... развёўся і згодны чакаць (хоць да скону!) пакуль тое ж не зробіць яна, бо шлюб без кахання — гэта злачынства... Куды горшае, чым каханне без шлюбу!

...Старая байка. Усе чалавечыя пачуцці сабраліся неяк разам, і Вар'яцтва, калі Сум пазяхнуў трэці раз, раптам сказала: «А давайце гуляць у хаванкі». «Як гэта?» — зашумелі пачуцці. «Ды проста! Адзін водзіць (заплюшчвае вочы і лічыць да ста), астатнія хаваюцца...».

Апатыя гуляць адмовілася — ёй было не цікава. Праўда — таксама, бо яе, сказала, усё роўна знойдуць... Лянота прытулілася за бліжэйшым каменем. Вера паднялася высока ў нябёсы. Зайздрасць зайшла ў цень да Трыумфу. Прыгажосць схавалася на дне возера, Страх — у расколе дрэва, Свабода — у подыху ветру, Страсць — у жарале вулкана. Бяспамяцтва... Не помню, дзе...

А Вар'яцтва — лічыць! 99 ужо, і без схованкі толькі Каханне: куды ні ткнецца яно, усе месцы занятыя.

У апошні момант убачыла — ружа побач цвіце. Сіганула ў куст.

«Сто», — сказала Вар'яцтва і пайшло шукаць.

Першай яно знайшло Ляноту. Потым — сама сябе выдала Вера (стала на нябёсах спрачацца з Богам). З вулкана азвалася Страсць. Убачыўшы Зайздрасць, няцяжка было «вылічыць» Трыумф, а сеўшы ля возера, каб адпачыць — саму Прыгажосць...

Нідзе не было Кахання... Вар'яцтва шукала яго за кожным дрэвам, у кожным раўчуку... А калі нарэшце расхінула куст, адтуль данёсся адчайны крык: ружа сваімі вострымі шыпамі параніла Каханню вочы.

Вар'яцтва было ў адчаі, яно не ведала, што рабіць. І, каб хоць неяк загладзіць віну, паабяцала, што на векі вечныя стане яму павадыром...

Вось з гэтай гульні ўсё і пачалося: каханне засталося сляпым.

А Вар'яцтва — водзіць яго за руку.

Ад адных да другіх.

Валянціна ДОЎНАР.

На рачнога бабра — з ружжом

З 1 кастрычніка, згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, у краіне распачынаецца чарговы асенне-зімовы сезон палявання.

У прыватнасці, па 15 снежня загонам і з паляўнічымі сабакамі (акрамя хартоў і ганчакоў) у светлы час сутак і з засады з вышак, з падыходу на працягу сутак дазваляецца здабываць лася, высакароднага аленя, дзіка, казулю. Паляванне рыжэйным спосабам распаўсюджваецца на жывёлу любога полу і ўзросту, акрамя свінамак—важакоў статку.

Таксама з 1 кастрычніка распачынаецца асенне-зімовы сезон палявання на рачнога бабра і рачную выдру. Дазволены ён будзе па 31 снежня ў светлы час сутак на жывёлу любога полу

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

28

ВЕРАСНЯ
2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 40 (15491)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

МІНСК, МЯЦЁЛКА, ЛЮДЗІ...

...Жылі-былі людзі ў светлым і прыгожым горадзе. І назва горада — Мінск. І ўсе мінчане ганарыліся, кажучы: «Мінск — чысты горад». Ішоў дзевяты месяц года 2007-га...

Прадмова: словы і лічбы

Мінск — чысты горад. Я задумалася: няўжо гэта нашыя грамадзяне такія адказныя і заўсёды прыбіраюць за сабой смецце? Насамрэч, смецце з дарог, плошчаў, тратуараў прыбіраюць работнікі прадпрыемства «Рамаўтадар». У кожным раёне Мінска — сваё аддзяленне. Я звярнулася ва УП «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама», і мяне накіравалі ў Заводскі раён, маўляў, вялікая тэрыторыя, прыватны сектар, прамысловыя прадпрыемствы...

— Працягласць дарог, якія мы ўбіраем, прыкладна 150 км. На нашай тэрыторыі 185 прыпынкаў грамадскага транспарту. Усяго работнікаў у нас 264 чалавекі. Большая частка супрацоўнікаў — прыбральнікі тэрыторыі, — расказваў мне Сяргей Анатольевіч Гомераў, дырэктар «Рамаўтадара Заводскага раёна». — Сёння асноўны націск ставіцца на механізаванне працы. На ўвесь наш раён працуе чатыры спецыяльныя машыны, якія збіраюць смецце самі. Гэтага не хапае, тым больш што тэхніка, здараецца, ламаецца. Без ручной працы абысціся нельга.

Менавіта работа прыбіральшчыкаў цікавіла мяне больш за ўсё. На маю просьбу, ці магу я адпрацаваць адну змену з брыгадай на вуліцах горада, Сяргей Анатольевіч даў «добра». Наступнай раніцай у 7 гадзін на Партызанскім праспекце я сустрэлася з брыгадзірам.

Пачатак: «офіс»

Сустракаючыся раніцай, брыгада прыбіральнікаў, якая рухаецца па вуліцах (у народзе проста «мабільная» брыгада), збіраецца ў «офісе», п'е «гарбату-каву», каму што падабаецца, пасля чаго на «служовым транспарце» накіроўваецца па заданнях на дзень. У брыгадзе 14 жанчын, але адначасова працуюць звычайна 10—11 чалавек (астатнія на выхадным дні). Усе яны крыўдзяцца, калі іх «офіс» называюць скрынямі — як яно ёсць у сапраўднасці. У скрынях «кава» і «гарбата» — мяцёлкі, якія трэба перавязаць, і саўкі. Брыгадзір Алена Фёдараўна адразу пазнаёміла мяне з жанчынамі, выдала аранжавую форму. Потым разам з усімі я збірала свае прылады працы: перабірала галінкі, перавязвала іх, замацоўвала на ручцы. Ад ранішняга холаду пальцы дранцвелі нават у пальчатках.

Пакуль ішлі да прыпынку «службовага транспарту», Алена расказала пра тэхніку бяспекі: зашпіленая вопратка, у тым ліку і рукавы, — каб не зачапіцца за што, пільная ўвага на дарозе, добры стан ручкі мяцёлкі — каб не параніцца...

У тралейбусе я запытала, ці можна бясплатна ездзіць па заданнях супрацоўнікам «Рамаўтадара».

— Калі мы з мяцёлкамі, нас не чапаюць — баяцца, напэўна, — усміхнулася брыгадзір, — а калі едзем у форме, але без прылад працы, тады могуць папрасіць выйсці.

Частка асноўная: з мятлой

Брыгада падзялілася на дзве часткі: адна накіравалася да ўнівермага «Беларусь», другая — у процілеглы канец праспекта, да станцыі метро «Магілёўская». Сустрэцца павінны былі недзе пасярэдзіне.

Пакуль мы прыбіралі каля ўнівермага, я даведалася, што ўся тэрыторыя падзелена на зоны. Усё, што датычыцца газонаў, прыбірае прадпрыемства «Зелянбуд». За падземныя пераходы адказвае «Гараўтамост», пераходы метро прыбіраюць супрацоўнікі метрапалітэна. Лесвіцы і тэрыторыі каля магазінаў і прадпрыемстваў — прыбральшчыкі гэтых магазінаў і прадпрыемстваў. За 185 прыпынкаў грамадскага транспарту адказваюць іншыя брыгады «Рамаўтадара раёна».

...Пасля гадзіны работы мы спыніліся на пятнаццаць хвілін — адпачыць. Што зварыць на вячэру мужу і дзецям, дзе набыць танны абутак на працу, хто колькі заплаціў за кватэру ў гэтым месяцы, колькі каштуе губная памада... Я слухала, аб чым размаўлялі жанчыны. Звычайныя людзі, з сем'ямі, з планамі на будучыню, некаторыя — з вышэйшай адукацыяй. Успомнілася, як даволі часта кажуць пра прыбральшчыкаў: п'яніцы, лайдакі, якіх адусюль звальняюць, недалёкія, заўсёды брудныя... Стала нават крыўдна. Грамадзяне чытачы! Што Мінск — горад чысты, я адчула ўжо праз некалькі працоўных гадзін і спінай, і нагамі, і рукамі, на якіх з'явіліся мазалі. Нават пальцы адмаўляліся мяне слухацца, калі ўвечары, крыху адпачыўшы пасля змены, я спрабавала набраць матэрыял на кампʼютары. Каб падмесці праспект (а гэта, паводле слоў дырэктара, «твар Заводскага раёна») і 4—6 вуліц, дзённая норма (а здараецца і больш), трэба добра стаяць на нагах і мець моцныя рукі. Ніякі лайдак ці п'яніца не будзе і ў холад, і ў дождж прыбіраць смецце за іншымі.

«Эпітэты» кшталту «недалёкія» таксама не падыходзяць. Насамрэч, больш блізка да рэчаіснасці слова «простыя». Не трэба ведаць складаных формул і тэрмінаў, каб разбірацца ў сродках ад накіпу, смачна гатаваць, умець весела адпачываць, любіць сваю працу, спакойна рэагаваць на не зусім прыемныя выказванні з боку прахожых. Дастаткова звычайнай хыццёвай мудрасці. І за сабой жанчыны сочаць. На працу ідуць з манікюрам, макіяжам, у чыстай працоўнай вопратцы.

— Бывае, у аўтобусах пасажыры грэбуюць нават дакрануцца да нашай вопраткі, — расказвала Алена. — Быў такі выпадак: жанчына нават скрывілася, калі міма праходзіла. А я ёй і кажу: «Паслухайце, ваша паліто не мылася ўжо дваццаць гадоў, а я сваю форму мыю два разы на тыдзень»...

Месці, месці, месці... Толькі праз гадзіну ці больш другі адпачынак. Дзве часткі брыгады сустрэліся. Напарадзе яшчэ чатыры вуліцы. Крыху пасядзелі — і наперад.

— Добра, калі з раніцы прайшла «шчотка» (трактар, які змятае смецце з сярэдзіны дарог і тратуараў і прыбівае яго да бардзюраў. — **Н.К.**), — брыгадзір спрытна выграбала лісце з-за прыпаркаванай каля бардзюра машыны. — Але калі яны ламаюцца, трэба рабіць усё сваімі рукамі.

Як магла, я старалася зграбаць лісце ў кучкі, якія потым павінны сабраць грузчыкі ў спецыяльную машыну. Аўтамабілі ўздоўж тратуараў стаялі шчыльненька і перашкаджалі мне і брыгадзе падмятаць. Памятаю, Сяргей Анатольевіч, дырэктар, казаў, што гэта адна з праблем нялёгкай працы прыбіральшчыкаў. Гэтыя машыны перашкаджаюць не толькі змятаць смецце, але і збіраць потым яго. Узімку і вясной прыходзіцца нават звяртацца па дапамогу ў ДАІ, каб адцягваць машыны...

Частка апошняя: чым ганарыцца

Напэўна, у мяне выраслі крылы — пасля дзённай змены я не адчуваю ні ног, ні зямлі пад імі. Напарадзе яшчэ дзве гадзіны працы ўвечары — трэба зноў прыбраць Партызанскі праспект. Чатыры гадзіны пакуль можна адпачыць...

Прыбіральшчык — прафесія, якая не патрабуе спецыяльнай кваліфікацыі. За дзень я навучылася «падхопліваць» (адным узмахам змятаць) і «акучваць» (збіраць у кучы) смецце. Я працавала не за грошы, а, як кажуць, за інтарэс. А прыбіральшчыкі звычайна атрымлівае прыблізна 500—700 тысяч штомесяц. Аклад 175 тысяч. Астатняя сума атрымліваецца праз прэміі, даплату за шкодныя ўмовы працы (забруджанасць паветра, маразы і дажджы і г.д.), надбаўкі за стаж. Так, прыбіральшчыкі атрымліваюць нямала. Але і праца насамрэч цяжкая. Таму калі вы іншы раз два лішнія крокі ступіце і смецце патрапіць у сметніцу, вы зможаце ганарыцца тым, што зрабілі свой горад больш чыстым.

Стаіць светлы горад Мінск. І жывуць у ім людзі, якія ганарацца, што горад іх чысты. І толькі людзі ў аранжавай працоўнай вопратцы ведаюць, чаму гэта так...

Пасляслоўе

Каментарый **Юрыя Міхайлавіча СМЫКАЛАВА, намесніка начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела УП «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама»:**

— Раз на тыдзень (калі не ўлічваць штотыднёвых праверак санстанцыі. — **Н. К. аўтара**) у кожным раёне бывае праверка. Па выніках праверкі складаецца спіс прадпісанняў, што неабходна зрабіць ва ўстаноўлены тэрмін. Праблем з выкананнем прадпісанняў у Заводскім раёне няма. Наогул заўважаю наконт чысціні вуліц і тым больш Партызанскага праспекта ў раёна мала. Больш праблем з прыпынкамі грамадскага транспарту і з неабходнасцю замены сметніц, частак прыпыначных пабудоў і г. д. Аднак ніякіх сур'ёзных парушэнняў ці невыканання прадпісанняў за гэтым раёнам не было.

Настасся КАРАЦЕЕВА. Фота аўтара.

ВУСАТЫ «НЯНЬ» У ДОМЕ «ЧУЖЫХ МАМ»

Выпрабавана на сабе

За 8 месяцаў 2007 года ў 16 сацыяльных прытулках Брэсцкай вобласці прайшло рэабілітацыю 547 непаўналетніх дзяцей: 315 з іх былі вернуты ў біялагічныя сем'і, 20 працэнтаў аформлены ў апякунскія і прыёмныя сем'і, 20 — накіравана ў школы-інтэрнаты, 7 — у іншыя ўстановы, і толькі двое дзяцей былі ўсыноўленыя.

Афіцыйна сацыяльны прытулак — часовае месцазнаходжанне для дзяцей, якія, паводле рашэння камісіі па справах непаўналетніх, былі аднесены да ліку тых, каму неабходна абарона дзяржавы. А такое рашэнне прымаецца ў чатырох выпадках: бацькі злоўжываюць алкаголем, ухіляюцца ад выхавання дзяцей, абодва з'яўляюцца беспрацоўнымі, ці калі дзецям даводзіцца жыць у антысанітарных умовах. Для большасці дзяцей сацыяльны прытулак — гэта паўгода чакання, што ўсё зменіцца і яны, нарэшце, атрымаюць тое, аб чым большасць іх аднагодкаў нават не задумваецца — сям'ю. Каб даведацца, чым жа вымяраецца дзіцячае шчасце: смачным абедам і чыстай бялізнай ці хоць вельмі рэдкай, але ж матчынай пяшчотай, я вырашыў уладкавацца на адзін дзень выхавальнікам у сацыяльны прытулак Маларыцкага раёна

«Назад толькі ракі поўзаюць»

— Добра! Думаю, у вас атрымаецца, — падтрымала маю ідэю дырэктар сацыяльна-педагагічнага цэнтра (СПЦ) Ірына Федчык. — Тым больш, што дзецям не хапае мужчынскай увагі: усе нашы выхавальнікі — жанчыны. А што датычыцца пытання «Калі?», я параіла б суботу ці нядзелю, бо ў астатнія дні старэйшыя выхаванцы большасць часу праводзяць у школе.

Я і сам спадзяваўся, што атрымаецца, бо ўжо неаднаразова бываў ва ўстановах такога тыпу, а аднойчы нават настаўнікам у школе папрацаваць давялося. Ды і маючы 10 пляменнікаў, соромна было б не ўмець знаходзіць з дзецьмі агульную мову. Праўда, калі даведаўся, што працаваць давядзецца з 19 дзецьмі ва ўзросце ад 4 да 13 гадоў, упэўненасці стала напалову менш: агульная мова — гэта адно, а вось знайсці цікавы занятак для такой колькасці невядомых табе дзяцей — зусім іншае. «Назад толькі ракі поўзаюць» — гаворыць народная мудрасць, а паколькі з членістаногімі ў мяне нічога агульнага няма, я, перабраўшы ў галаве ўсе дзіцячыя гульні, цвёрда вырашыў: «Пайду!».

«Вы хацелі сказаць «прытулак?»

Раніцай наступнага дня я нясмела крочыў па прытулку. Такая знаёмая атмасфера ўтульнасці і цеплыні... Толькі не звыклай хатняй, а, хутчэй, той, што звычайна прысутнічае ў школе ці дзіцячым садку. Было амаль 9 гадзін, дзеці толькі прачнуліся і збіраліся снедаць. Дзяжурныя дапамагалі накрываць сталы, у астатніх былі свае клопаты.

— Гэта — Аляксандр Якаўлевіч. Сёння ён будзе працаваць з вамі, — лаканічна прэзентавала мяне выхавальніца, на што дзеці хорам выдалі: «Добры дзень».

На новага чалавека ў калектыве, асабліва дзіцячым, заўсёды розная рэакцыя: адны пачалі сарамліва хавацца, другія наадварот — дэманстраваць свае выключныя ўменні і здольнасці.

— Калі хочаце, мы з Дзімкам і Надзькай пакажам, як умеем брэйк танчыць, — прапанаваў пасля снедання старэйшы з выхаванцаў, 8-класнік Сяргей.

— Безумоўна, хачу, — адказаў я, адчуваючы, што мяне прымаюць і дазваляюць быць сёння калі не сябрам, то, прынамсі, выхавальнікам. — Толькі скажы, дзе вы гэтаму навучыліся?

— Самі, у лагеры адпачынку. І ўвогуле мы не толькі брэйк умеем танчыць. Бачыце — вунь там аб'ява? Гэта я набіраю дзяцей у секцыю па кунг-фу.

Жыццё ў доме дзіцячых галасоў віруе. Праўда, пад пільным наглядам выхавальнікаў, з іх дапамогай і, адпаведна прадугледжанаму раскладу: пад'ём — сняданне — абед — ціхая гадзіна — вячэра — адбой. Час у прамежках — дзецям і дзеля дзяцей. Тут табе і спартыўна-культурныя мерапрыемствы, і заняткі па інтарэсах — галоўнае, каб дзеці адчувалі ўвагу да сябе і пры гэтым прызвычайваліся да дысцыпліны. Пры такой колькасці дзяцей рознага ўзросту выхавальніку складана знайсці падыход да кожнага. Вось, напрыклад, Валерыя мова весяліцца, узгадаць маму і рэзка расплакацца. Надзя ўвогуле імкнецца быць адна. На дапамогу прыходзіць псіхолаг. Ён правядзіць дыягностыку і з улікам узроставых асаблівасцяў дзяцей складае характарыстыку-рэкамендацыю, згодна з якой на аднаго патрэбна пастаянна звяртаць увагу, каб ён не замыкаўся ў сабе; другога — хваліць, бо інакш ён не навучыцца верыць у свае сілы.

— Вось зараз прыйдзем дадому, навучу вас жаравай з паперы рабіць, — звяртаюся да маленькага Сяржы падчас прагулкі.

Той усміхаецца, бярэ мяне за руку і папраўляе: «Вы хацелі сказаць: у прытулак?»

Маці заўсёды павінна быць моцнай

Ціхая гадзіна — гэта ў прытулку святое. Падчас яе адпачываюць не толькі дзеці, але і выхавальнікі. Мне ціхая гадзіна давала магчымасць нарэшце пазнаёміцца з калегамі. Па іроніі лёсу маларытчанка Наталля зараз часова працуе ў СПЦ. У чым іронія? Год таму і яе 7-гадовая дачка Марынка праходзіла тут курс рэабілітацыі. Пра той час Наталля не можа ўзгадваць без слёз на вачах:

— Запіла. Звольнілі з працы. Муж, быццам, паехаў на заробкі, звaліўшы ўсе праблемы на мяне. Толькі зараз, калі з ім разышлася, разумею, што так было з першага дня нашага сумеснага жыцця. Зараз я разумею сваю памылку: бацькі не маюць права на слабасць. Калі ты маці, дык заўсёды павінна быць моцнай.

— Ці дастаткова для таго, каб зноў пачаць нармальнае жыццё, на цвярозую галаву зразумець, што дзеці табе даражэй за ўсё?

— Так, гэта вельмі важна, але аднаго разумення не хопіць. Патрэбна сур'ёзная падтрымка з боку родных, бо вярнуць дзяцей складаней, чым страціць. Акрамя псіхалагічных момантаў, неабходна яшчэ выканаць шэраг пунктаў дамовы, якую з табой заключаць у СПЦ. Згодна з яе ўмовамі бацькі абавязаны прайсці курс лячэння ад алкагалізму, навесці парадак у доме, пакрыць усе затраты на ўтрыманне дзяцей у прытулку. Мне дапамагла сястра, за што заўсёды буду ёй удзячна.

— Хоць на хвіліну можаце ўявіць, што вы не змаглі вярнуць дачку?

— Якое «не змагла вярнуць»?.. Мне нават не верыцца, што гэта ўвогуле было. Глядзу на дзяцей: іх і даглядаюць, весела ім, але ж гэта не заменіць маму і тату. Добра што бацькам даюць час падумаць і выправіць свае памылкі, хоць і не ўсе думаюць, і далёка не ўсё можна выправіць... Аднойчы жанчына прыехала наведаць сваё дзіця, тое паглядзела на маці і сказала: «Яшчэ раз прыедзеш — заб'ю»...

За атмасферай у кожнай адноўленай сям'і на працягу трох месяцаў сочаць прадстаўнікі СПЦ і аддзела адукацыі. Калі ўсё добра, нагляд здымаецца, у адваротным выпадку дзяцей зноў забіраюць. Ужо назаўсёды. Але, як прызналася Ірына Мікалаеўна, за час існавання сацыяльнага прытулку такога яшчэ не было.

Гульні, песні, танцы, слёзы па дому, бляск радасці ў вачах. Так незаўважна прайшлі мае 12 гадзін у сацыяльным прытулку. 12 гадзін — гэта дзве змены для выхавальніка. Мне гэтага часу хапіла, каб зразумець, чаму ў прытулку іх працуе ажно сем: дзеці патрабуюць поўнай аддачы. Выхавальнікі не шкадуюць для іх сваёй энергіі, пяшчотных слоў, добрых парад. Ім яны... Ну, як мамы! Толькі чужыя.

Аляксандр АЛЕСІК.
Фота аўтара.

г. Маларыта.

ВУЧЭННЕ НАБЛІЖАЕЦЦА

Больш як 7500 чалавек асабовага складу, больш за 1000 адзінак бранятанкавай і аўтамабільнай тэхнікі, 16 самалётаў і верталётаў будуць задзейнічаны ў камандна-штабным вучэнні, якое адбудзецца ў Беларусі з 5 па 10 кастрычніка ў адпаведнасці з Планам падрыхтоўкі Узброеных Сіл у 2007 годзе. У ім возьмуць удзел злучэнні і вайсковыя часці Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны, Сухапутныя войскі, камандаванне сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл, войскі тэрытарыяльнай абароны, сілы і сродкі Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў Беларусі. Таксама плануецца ўдзел групы афіцэраў Узброеных Сіл Расіі.

Камандна-штабное вучэнне пройдзе ў два этапы. У першым будуць адпрацаваны пытанні выкарыстання Узброеных Сіл, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў ва ўмовах нарастання ваеннай пагрозы (на гэтым этапе будзе здзейснены прызыў 850 ваеннаабавязаных з запасу). На другім этапе будуць выкарыстаны Узброеныя Сілы і сродкі ва ўмовах процідзеяння дэсантна-дыверсійным сілам і незаконным узброеным фарміраванням. Задачы будуць выконвацца ў пунктах пастаяннай дыслакацыі ўдзельнікаў камандна-штабных вучэнняў, а таксама на Дрэтуньскім і Барысаўскім агульнавайсковых палігонах, тэрыторыі Полацкага і Пастаўскага раёнаў, Гродзенскага, Астравецкага і Смаргонскага, Маладзечанскага раёнаў.

Ірына ПРЫМАК.

МОЛАДЗЬ — ЗА СЯБРОЎСТВА

Сёння ў Растове-на-Доне пачаўся II Міжнародны маладзёжны фестываль «Моладзь за Саюзную дзяржаву». У складзе дэлегацыі ад нашай краіны ў фестывалі бяруць удзел прадстаўнікі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

У рамках фестывалю адбудзецца міжнародны конкурс выканаўцаў маладзёжнай песні, пасяджэнне маладзёжнага дыскусійнага клуба. Запланаваны форум маладых журналістаў абедзвюх краін-суседак...

Наталля НОВІК.

Пыталіся — адказваем

ДЖЫНСАВАМУ АДЗЕННЮ Ў ШКОЛЕ НЕ МЕСЦА?

У рэдакцыю звярнуліся старшакласнікі аднаго з райцэнтраў Віцебскай вобласці. Іх, у прыватнасці, цікавіла, ці можа настаўнік або дырэктар школы не дапусціць да заняткаў вучня, які прыйшоў у школу ў джынсах? Нашы юныя чытачы спасылаліся на тую акалічнасць, што дзелавы стыль адзення абавязковы толькі для пачатковай школы і 5—9-х класаў. Аб гэтым яны, дарэчы, даведаліся са «Звязды». Дык чаму ў такім разе джынсы аказаліся ў старшай школе пад забаронай? Джынсы — самае зручнае і камфортнае адзенне, даступнае сем'ям з любым даходам. Да таго ж белая ці блакітная блуза ці кашуля, апранутая пад джынсавы касцюм, робіць выгляд школьніка цалкам прыстойным.

— Сапраўды, увядзенне ў школе дзелавога стылю адзення праходзіць паэтапна, — паведаміла журналісту «Звязды» **намеснік начальніка ўпраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Валянціна МАЕЎСКАЯ**, да якой мы звярнуліся па каментарый. — Першымі на дзелавы стыль адзення перайшлі вучні пачатковай школы, а з гэтага навучальнага года дзелавы стыль адзення стаў абавязковы і для вучняў 5—9-х класаў школ. Для старшай ступені школы дзелавы стыль пакуль толькі рэкамендаваны. Мы добра разумеем, што 10—11-ы класы — гэта менавіта той узрост, калі падлеткі імкнуцца да індывідуальнасці і прад'яўляюць асабліва высокія патрабаванні да свайго знешняга выгляду. Таму мы не навязваем ім нейкія канкрэтныя мадэлі, прапанаваныя на школьных кірмашах. Хоць калекцыя адзення дзелавога стылю для школьнікаў, распрацаваная канцэрнам «Беллегпрам», дае шырокія магчымасці для выбару.

І ўсё ж такі, мушу заўважыць, што адзенне павінна вучняў дысцыплінаваць і спрыяць стварэнню ў навучальнай установе дзелавой абстаноўкі. А паколькі ўяўленні старшакласнікаў і педагогаў пра дзелавы стыль не заўсёды супадаюць, Міністэрства адукацыі дало падрабязнае тлумачэнне гэтага паняцця.

Дзелавы стыль адзення — гэта строгі вытрыманы стыль адзення, прызначаны для наведвання навучэнцамі вучэбных заняткаў у агульнаадукацыйных установах. Увядзенне дзелавога стылю адзення мае на мэце выхаванне правілаў этыкету ў падрастаючага пакалення, уменне ранжыраваць адзенне на розныя стылі.

Камплект адзення дзелавога стылю павінен быць шматфункцыянальным, гігіенічным, зручным і адпавядаць сучасным накірункам моды. Для хлопчыкаў (юнакоў) у камплект уваходзяць пінжак, камізэлька, штаны, кашуля з кароткімі і доўгімі рукавамі і гальштук. У зімовы час у камплект могуць уваходзіць таксама трыкатажны світар і камізэлька.

Для дзяўчынак — пінжак, камізэлька, спадніца, штаны, блуза з кароткімі ці доўгімі рукавамі, сарафан. У зімовы час у камплект могуць уваходзіць трыкатажны світар ці камізэлька.

Адзенне дзелавога стылю можа быць выканана з тканін рознай структуры (шэрсці, паўшэрсці, баваўны ці камбінаваных тканін) і ў рознай каляровай гаме (уключаць элементы з тканін у клетку, але не быць стракатым і занадта яркім).

Але джынсавае адзенне — гэта адназначна не дзелавы стыль, прашу звярнуць на гэта ўвагу. Цяпер па другой частцы пытання. Не дапусціць вучня да навучальнага працэсу толькі па той прычыне, што ён апрануты ў джынсы, педагог не мае права. Настаўнікі павінны праводзіць з вучнямі і іх бацькамі тлумачальную работу, каб не дапускаць такіх сітуацый.

Надзея НІКАЛАЕВА.

PaWWWуцінне ад Вікторыі Захаравай

КОЛЬКІ KOSHTУ?

Аднаму са старэйшых беларускіх Інтэрнэт-рэсурсаў, спажывецкаму парталу KOSHT.com споўнілася 8 гадоў. Калі ў 1999 годзе рэсурс пачынаў працаваць як першы ў Байнэце электронны даведнік па цэнах на кампʼютары і камплектуючыя, то сёння гэта вялікі партал са шматтысячнай аўдыторыяй і шырокім наборам сэрвісаў.

Штодня на партале адбываецца абнаўленне каталогу — 80 тысяч тавараў ад вядучых вытворцаў. Акрамя таго, карыстаюцца папулярнасцю сэрвіс прыватных бясплатных абвестак BU.KOSHT.com, банк вакансій Job.KOSHT.com, спажывецкія навіны, параўнальныя рэйтынгі тавараў, агляды рынку. Як мяркуе дырэктар парталу Дзмітрый Качаноўскі, галоўнае дасягненне каманды праекта — магчымасць хутка і якасна прайсці ланцужок з трох «П»: пошук, падрабязнасці, пакупка.

ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ ЗАКАНЧВАЕЦЦА! Не спазніцеся!

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю па адрасе: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 29 верасня 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **5 кастрычніка 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 17 кастрычніка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 снежня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2007 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 5 верасня 2007 года. Удачы ў гульні!

8 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2007 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на IV квартал 2007 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____ Колькасць камплектаў _____

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
(прозвішча, ініцыялы)

Куды _____
(адрас)

_____ _____
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету _____ (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб.; перадрасоўкі _____ руб. Колькасць камплектаў _____

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
(прозвішча, ініцыялы)

Куды _____
(адрас)

_____ _____
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

«Жывы тавар»

МАЛАДОСЦЬ — У РАБСТВА

На сёння ў нашай краіне амаль знікла праблема беспрацоўя. Аб'явы з патрабаваннем рабочых вісяць паўсюдна. У Інтэрнэце ёсць цэлыя сайты з прапановамі рабочых вакансій. А колькасць газет з адпаведнымі прывабнымі назвамі — нават не пералічыць. Як кажуць, не працуе толькі лянівы. Аднак не ўсе імкнуцца зарабляць сабе на пражыванне такім цяжкім шляхам, як работа. Тым больш, калі ёсць шмат іншых спосабаў атрымаць «лёгкі хлеб». Напрыклад, заняцца гандлем... жывым таварам.

Праблема барацьбы з гандлем людзьмі зусім не новая для Беларусі. З кожным годам у краіне расце колькасць так званых трафікёраў, якія займаюцца вярбоўкай і вывазам маладых дзяўчат за мяжу. Прычым, як аказваецца, гэта даволі прыбыткова. Мяркуйце самі: па адзнаках экспертаў толькі ў кішэнях беларускіх пасрэднікаў за год асядае 11—12 млн долараў.

Выкрываць такія злачынствы складана. Пацярпелыя рэдка звяртаюцца ў праваахоўныя органы, таму што баяцца сябе выдаць. Таму ўвесь цяжар гэтай работы кладзецца на плечы супрацоўнікаў міліцыі.

Самае цікавае, што такі злачынны спосаб зарабіць на жыццё сустракаецца не толькі ў буйных гарадах, але і ў раённых цэнтрах. Не абышла гэта з'ява і горад Рагачоў Гомельскай вобласці.

* * *

Таню можна было назваць паспяховым чалавекам. Клапатлівыя, забяспечаныя бацькі, два любімыя малодшыя браты, шмат добрых сяброў... Школу Таня скончыла з залатым медалём. Была мара — стаць урачом-педыятрам, бо вельмі любіла маленькіх дзяцей. Без цяжкасцяў паступіла ў Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Скончыла яго з чырвоным дыпломам. Па ўласным жаданні паехала працаваць ў свой родны горад, каб быць бліжэй да сваёй сям'і.

Ліда ўварвалася ў жыццё маладой дзяўчыны як ураганны вецер — нечакана і імкліва. Пазнаёміліся на дыскатэцы, куды дамаседку-Таню ледзьве выцягнуў брат. Ліда доўга назірала за дзяўчынай, потым падышла і арганічна ўлілася ў іх кампанію, якая танцавала. З таго часу дзяўчаты сталі сябраваць. Дзякуючы Танінай маладосці і наіўнасці, Лідзе было няцяжка ўвайсці да яе ў давер. Даведаўшыся, што зарабляе малады педыятр у раённай паліклініцы нямшмат, новая «сяброўка» прапанавала ёй высокааплатную работу ў сферы абслугоўвання... Афіцыянткай... у Маскве. Пасля перакананняў «сяброўкі» ў тым, што ў Рагачове яна дарэмна губляе час, Таня згадзілася.

З той пары прайшоў год. За гэты час бацькі не атрымалі ад дачкі ніводнай вестачкі. Міліцыя пакуль безвынікова займаецца яе пошукамі.

* * *

А літаральна ў канцы жніўня супрацоўнікам крымінальнай міліцыі РАУС стала вядома, што 23-гадовая жыхарка Рагачова займаецца вярбоўкай і вывазам дзяўчат у Расію (у Маскву і Падольск) для заняткаў прастытуцыяй.

Старшы оперупаўнаважаны групы па нарканагляду і процідзеянню гандлем людзьмі Мікалай Кухарэнка паведаміў:

— Маладая жанчына наладзіла сувязь з сутэнёрамі расійскіх гарадоў. Дзяўчат прадавала за 100 долараў. Менавіта на такую суму іх ацэньвалі. Вазіла рагачоўская трафікёрша па тры дзяўчыны ў месяц. Большасць завербаваных былі непаўналетнімі. Дваім пашчасціла збегчы ў момант перапраўкі. На спадарожных машынах яны павярнулі ў Рагачоў.

Злачынца была затрымана. Зараз яна знаходзіцца пад вартай. Пакуль што стала вядома, што прадала яна дзевяць дзяўчат. Узбуджана крымінальная справа па артыкулу 171 частцы 2 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Трафікёршы пагражае тэрмін ад 7 да 10 гадоў пазбаўлення волі з поўнай канфіскацыяй маёмасці. Але гэта адказнасць, якая чакае злачынцу, нішто ў параўнанні з загубленым жыццём прададзеных ёю дзяўчат. Нішто ў параўнанні з загубленай маладосцю, прададзенай ў рабства...

Вікторыя РАГОЖНІКАВА.

Пазнай свой край

Восень у Ракаве: вандроўкі па часе

Пабудаваў тут калісьці вялікі замак асілак па імені Рак і даў яму сваё імя. Адсюль і пайшла назва адной з самых вядомых у Беларусі мясцін — цяпер вёскі, а раней мястэчка і ў былыя часы цэнтра асобнага графства. Сярод тутэйшых жыхароў можна пачуць і іншыя версіі: маўляў, усё з-за ракаў, якіх і дасюль можна выцягнуць з Іслачы.

А вось іншыя выводзяць назву ад размяшчэння вёскі, праз якую працякае маляўнічая рака. Як яно было ў сапраўднасці, цяпер, напэўна, цяжка вызначыць. Але няшмат знойдзеш у Беларусі такіх мясцін, дзе можна з лёгкасцю апынуцца ў мінулым, павандраваць па часе.

Ірына СУПРАНОВІЧ, вучаніца трэцяга класа Ракаўскай школы, цікавіцца гісторыяй родных мясцін.

Паселішча тут існавала яшчэ са старажытнасці, аб гэтым згадвае старое гарадзішча. Загадкавыя «валы» (так тут завуць рэшткі гарадзішча) вялікай падковай ахінаюць мястэчка. Упершыню Ракаў узгадваецца ў афіцыйных паперах XV стагоддзя. Да пэўнага часу ён быў уладаннем вялікага князя Казіміра Ягелона, які ў 1465 годзе падарыў гэтыя землі канцлеру Вялікага княства Літоўскага Міхаілу Кяжгайлу. Пасля імі валодалі Завішы, Сангушкі, Салагубы. Асобныя даследчыкі выказваюць думку, што напрыканцы XVIII стагоддзя Ракаў належаў Агінскім. Вядомы кампазітар прымаў удзел у паўстанні за незалежнасць, мабыць, таму зямлю канфіскавалі і пера-далі царскаму генералу Салтыкову. У яго Ракаўшчыну перакупілі паны Здзяхоўскія, якія ўладарылі амаль паўтара стагоддзя — з 1804 па 1939 год.

Многія кажуць, што менавіта пры гэтых гаспадарах жыццё асабліва віравала. З 1843 г. дзейнічалі мануфактуры, дзе вырабляліся розныя сельскагаспадарчыя машыны, — малатарні, сячкарні, веялкі, крупадзёркі, за якімі сюды прыязджалі пакупнікі не толькі з бліжэйшай акругі, а і нават з іншых губерняў. Далёка ішла слава пра тутэйшыя керамічныя вырабы. У 1880 годзе ў Ракаве працавала 16 ганчарных майстэрняў! Яшчэ добра быў вядомы тутэйшы рынак, дзе збіраліся тысячы гандляроў. Увогуле месячы адрозніваліся прадпрымальнасцю: на рынкавай плошчы ў свой час прапаноўвалі самыя розныя тавары дваццаць крамаў. Непадалёк красавалася і ратуша. Здзяхоўскія правялі ў Ракаў тэлефонную лінію (дарэчы, ці не першую на Беларусі). У 1915 годзе мяшчанін Невах-Гірша Хаімаў Пазняк арганізаваў «міжгароднія» аўтамабільныя перавозкі пасажыраў паміж Ракавам і Заслаўем. Працавалі пошта, чатыры вадзяныя млыны, цагельня, тартак.

У 1850 годзе паны Здзяхоўскія пабудавалі ў тагачаснай вёсцы Паморшчына броварр. Чаму зараз гэтую падзею тутэйшыя жыхары ўзгадваюць з асаблівым пачуццём? А ўсё ў тым, што на гэтым самым бровары працаваў Дамінік Луцэвіч — бацька беларускага песняра. Разам з жонкай Бянігнай яны арандавалі тут невялічкі ўчастак зямлі і з'ехалі ў Вязынку літаральна перад нараджэннем Янкі. Увогуле ракаўская зямля адметная многімі славутымі людзьмі. Напрыклад, браты Мар'ян і Казімір Здзяхоўскія — апошнія ўладальнікі тутэйшага маёнтка. Адзін з іх быў прафесарам Кракаўскага і Віленскага ўніверсітэта, другі — вядомым пісьменнікам. На тутэйшую пошту прыходзілі лісты ад самога Льва Талстога. На пачатку мінулага стагоддзя ў братоў гасцявала вядомая Эліза Ажэшка. Пісьменніца так была ўражана Ракавам, што назвала яго «паўночнымі Афінамі».

Адметныя архітэктурныя помнікі — старажытная царква і велічны касцёл. З сівой даўніны дайшла да нас легенда пра цудадзейную крыніцу. Расказваюць, што невідушчы чалавек у сне пачуў голас Панны Марыі, які загадаў яму накіроўвацца на ўсход і выкапаць невялікую ямку каля высокага дрэва. Пасля таго як сляпы так усё і зрабіў, на тым месцы пачала біць крыніца. Памыў чалавек вочы той вадой і стаў бачыць. Першае, што ўбачыў — абраз Божай Маці, ад якога струменілася нязмолкае святло. Людзі зразумелі, што гэта святое месца, пабудавалі тут капліцу, дзе захоўваўся абраз. Была тут Крыжаўздзвіжанская царква, якую разбурылі ў 60-я гады мінулага стагоддзя, а ў 1980-я спалілі і капліцу. Праўда, знайшліся людзі, якія адбудавалі новую — каменную, да якой мы таксама падышлі. Сімвалічна тут чытаюцца радкі з паслання святога апостала Паўла да галатаў: «З Бога не насмяешся».

У завулках старажытнага Ракава.

...Доўгія цені пралеглі па старой брукаванцы — увосень вечарэе вельмі хутка і прыгожа. На вуліцах шмат людзей, і ў кожнага свае клопаты. У цёплыя дзянькі бабінага лета месцічы, апранутыя «па-лёгкаму», з усмешкамі крочаць па роднаму мястэчку. Зусім хутка прыйдзе пара дажджоў, падчас якой Ракаў будзе не менш загадкавы і таямнічы. Варта завітаць.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
Мінск—Ракаў.

У БЕЛАРУСІ БУМ НА КІТАЙСКУЮ МОВУ

Гэтым назіраннем падзяліўся кіраўнік дыпламатычнай місіі Кітая ў Беларусі У Хуньбінь на ўрачыстай вечарыне ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі з нагоды 58-й гадавіны з дня ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Паводле слоў пасла, яго ўражвае жаданне нашых маладых людзей ведаць кітайскую мову. Яму нават бацькі дасылаюць лісты з просьбай дапамагчы ўладкавацца ў школы з яе вывучэннем. У Хуньбінь адзначыў, што ёсць усе ўмовы для ператварэння інстытута імя Канфуцыя ў Мінску ў цэнтр кітаязнаўства. У сваю чаргу няўхільна расце колькасць кітайскіх студэнтаў у беларускіх ВНУ. Яшчэ адносна нядаўна іх былі дзесяткі, цяпер ужо 1300.

Кітайскі пасол паведаміў, што яго краіна паспяхова ідзе па шляху сацыялізму са сваёй спецыфікай. За 30 гадоў правядзення рэформаў народнай гаспадаркі рост эканомікі ў сярэднім складаў 10 працэнтаў, а апошнія чатыры гады — звыш 10 працэнтаў. Сёння Кітай — чацвёртая дзяржава ў свеце, як выказаўся пасол, па аб'ёму эканомікі і трэцяя па ўзроўню знешняга гандлю. Ужо сёлета будзе запушчаны ў космас першы кітайскі спадарожнік.

Разам з тым У Хуньбінь звярнуў увагу прысутных на тое, што ў свеце не ўсім даспадобы гэтыя поспехі. Нядобразычліўцы распускаюць чуткі і плёткі аб нібы існуючай ваеннай, энергетычнай, харчовай «кітайскай пагрозе». Але, нягледзячы на ўсё гэта, КНР упэўнена рушыць наперад, умацоўвае стасункі са сваімі шматлікімі партнёрамі-краінамі.

У прыватнасці, з Беларуссю. Яе адносіны з Кітаем, паводле слоў пасла, развіваюцца стабільна, плённа і мэтанакіравана па ўзыходняй лініі. Гэта бачна на паказчыках узаемнага гандлю. За сем месяцаў ён склаў 500 млн долараў і ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года вырас на 71 працэнт. Сёлета гандлёвы абарот з КНР дасягне мільярднай рысы — гэты прагноз належыць У Хуньбіню.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Аўтажарсці

ГОНКІ Ў РОЗНЫХ НАКІРУНКАХ

Для кагосьці драгрэйсінг — хобі, для кагосьці — бізнэс

Пачатак восені ў аматараў драгрэйсінгу насычаны: 25 жніўня яны пазмагаліся за Кубак гарадоў Беларусі, 15 верасня — выпрабавалі свае аўто на закрыцці чэмпіянату краіны ў Быхаве, а 29 верасня іх чакае другі этап Кубка Беларусі ў Бабруйску. Куды паехаць, што байкатаваць — гарачыя дыскусіі разгарнуліся ў сеціве і ў рэале. Пра адметнасці спаборніцтваў у гэтым спецыфічным відзе аўтаспорту, пра перспектывы беларускіх аўтааматараў і філасофію гонак «Звяздзе» распавядаюць арганізатары гонак — Дзмітый Кажура і яго апаненты Айк Сіманян і Яўген Нікіцін.



«У БАБРУЙСКУ Я СТАЯЎ У ЧАРЗЕ»

Арганізатар чэмпіянату Беларусі па драгрэйсінгу Дзмітрый КАЖУРА:

— У закрыцці Адкрытага чэмпіянату Беларусі гэтым разам узялі ўдзел расійскія спартсмены. На жаль, добрых вынікаў яны не паказалі: аўтамабіль ВАЗ-2108, які прадстаўляў Расійскую федэрацыю аўтаспорту, падчас аднаго з першых заездаў выйшаў са строю. Прыехалі латышы на спецыяльна дапрацаванай для гонак Opel corsa 1,6 л. Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, на быхаўскім аэрадроме сабралася процьма народу — як гледачоў, так і ўдзельнікаў. Спрацавала папярэдняя рэкламная кампанія, да таго ж, мы добра зарэкамендавалі сябе папярэднімі спаборніцтвамі, многія ўжо ведаюць дарогу. Людзям цікава бачыць тэхнічныя віды спорту, якія ў нас, на жаль, не дамінуюць і маюць малую падтрымку.

— Навошта збіраюцца ўсе гэтыя людзі?

— У ЗША гэты спорт развівалі для барацьбы з нелегальнымі гонкамі, такім ён і прыйшоў да нас — як спосаб рабіць штосьці забароненае ў рамках закона.

— Ці не становяцца гонкі меней прывабнымі з набыццём легальнага статуса?

— Мы прыкладаем намаганні, каб заахвоціць удзельнікаў, рыхтуем грашовыя прызы, падарункі ад спонсараў. Авацыі, шанц пабачыць сябе па тэлебачанні — гэта сур'ёзная кампенсацыя.

— Чаму прызавы фонд закрыцця складае 500 долараў замежным удзельнікам і 600 тыс. беларускіх рублёў беларускім спартсменам?

— У замежных гасцей большыя выдаткі на тое, каб прымаць удзел. Нічога дзіўнага: на ўкраінскіх спаборніцтвах для беларусаў кошт заяванага ўзносу быў скасаваны напалову. У нас заявачнага ўзносу няма, а ёсць іншая магчымасць. Не падумайце, што было на мэце пакрыўдзіць беларусаў.

— Арганізацыя такіх спаборніцтваў — прыбытковы занятак?

— Безумоўна. Калі б мерапрыемства было стратным, мы рабілі бы захады для паляпшэння сітуацыі, а калі б яны не дапамаглі — мы кінулі б займацца гэтай дзейнасцю.

— Што самае складанае пры падрыхтоўцы правядзення такіх спаборніцтваў?

— Чаканне добрага надвор'я. З астатнімі праблемамі навучыліся спраўляцца — у Быхаве гэта ўжо 8-е спаборніцтва такога кшталту, а з тых, што я раздзіў — 10-е ці 11-е.

— Чым займаліся да таго, як пачалі арганізоўваць такія мерапрыемствы?

— Нелегальнымі аўтагонкамі. Але прыйшоў час, калі я зразумеў, што гоншчыкам патрэбна магчымасць паказаць сябе і сваю машыну не толькі знаёмым — дзесяткам знаўцаў ці малойчыкам са двара, а і шматтысячнаму натоўпу, гледачам з усёй рэспублікі. У Быхаве збіраюцца ўсе, не ведаю такога буйнога горада, які б не быў тут прадстаўлены.

— Як быхаўскі чэмпіянат канкурыруе з іншымі спаборніцтвамі па драгрэйсінгу, у чым яго адрозненне, напрыклад, ад Кубка па драгрэйсінгу, што пройдзе ў Бабруйску?

— Ён не канкурыруе. Пра якую канкурэнцыю гаворка, калі Бабруйск збірае пяць тысяч гледачоў, а Быхаў 10—15 тысяч? Калі ў нас больш класаў, а значыць, большы прызавы фонд? У нас больш удзельнікаў — цаліна ўдзельнікаў, якія ўжо ведаюць дарогу. Людзям цікава бачыць тэхнічныя віды спорту, якія ў нас, на жаль, не дамінуюць і маюць малую падтрымку.

ДАВЕДКА

***ДРАГРЭЙСІНГ** — гонкі двух удзельнікаў па прамой на 402 метры з максімальным паскарэннем . Такая дыстанцыя абраная не выпадкова: у сярэдзіне мінулага стагоддзя, калі гэты спорт толькі з'явіўся на свет у ЗША, менавіта 1/4 мілі прабягалі muscul-cars (аўтамабілі са шматлітровымі «монстрамі»-рухавікамі).*

Навошта збіраюцца ўсе гэтыя людзі?

— У ЗША гэты спорт развівалі для барацьбы з нелегальнымі гонкамі, такім ён і прыйшоў да нас — як спосаб рабіць штосьці забароненае ў рамках закона.

Ці не становяцца гонкі меней прывабнымі з набыццём легальнага статуса?

— Мы прыкладаем намаганні, каб заахвоціць удзельнікаў, рыхтуем грашовыя прызы, падарункі ад спонсараў. Авацыі, шанц пабачыць сябе па тэлебачанні — гэта сур'ёзная кампенсацыя.

Чаму прызавы фонд закрыцця складае 500 долараў замежным удзельнікам і 600 тыс. беларускіх рублёў беларускім спартсменам?

— У замежных гасцей большыя выдаткі на тое, каб прымаць удзел. Нічога дзіўнага: на ўкраінскіх спаборніцтвах для беларусаў кошт заяванага ўзносу быў скасаваны напалову. У нас заявачнага ўзносу няма, а ёсць іншая магчымасць. Не падумайце, што было на мэце пакрыўдзіць беларусаў.

Арганізацыя такіх спаборніцтваў — прыбытковы занятак?

— Безумоўна. Калі б мерапрыемства было стратным, мы рабілі бы захады для паляпшэння сітуацыі, а калі б яны не дапамаглі — мы кінулі б займацца гэтай дзейнасцю.

Што самае складанае пры падрыхтоўцы правядзення такіх спаборніцтваў?

— Чаканне добрага надвор'я. З астатнімі праблемамі навучыліся спраўляцца — у Быхаве гэта ўжо 8-е спаборніцтва такога кшталту, а з тых, што я раздзіў — 10-е ці 11-е.

Чым займаліся да таго, як пачалі арганізоўваць такія мерапрыемствы?

— Нелегальнымі аўтагонкамі. Але прыйшоў час, калі я зразумеў, што гоншчыкам патрэбна магчымасць паказаць сябе і сваю машыну не толькі знаёмым — дзесяткам знаўцаў ці малойчыкам са двара, а і шматтысячнаму натоўпу, гледачам з усёй рэспублікі. У Быхаве збіраюцца ўсе, не ведаю такога буйнога горада, які б не быў тут прадстаўлены.

Як быхаўскі чэмпіянат канкурыруе з іншымі спаборніцтвамі па драгрэйсінгу, у чым яго адрозненне, напрыклад, ад Кубка па драгрэйсінгу, што пройдзе ў Бабруйску?

— Ён не канкурыруе. Пра якую канкурэнцыю гаворка, калі Бабруйск збірае пяць тысяч гледачоў, а Быхаў 10—15 тысяч? Калі ў нас больш класаў, а значыць, большы прызавы фонд? У нас больш удзельнікаў — цаліна ўдзельнікаў, якія ўжо ведаюць дарогу. Людзям цікава бачыць тэхнічныя віды спорту, якія ў нас, на жаль, не дамінуюць і маюць малую падтрымку.

КВЗ супраць ДТЗ

Кожны тыдзень па ўсёй краіне супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі праводзяць дні бяспекі дарожнага руху, накіраваныя на прафілактыку дарожна-транспартных здарэнняў (ДТЗ) сярод непаўналетніх. У гэтую пятніцу карэспандэнту «Звязды» давялося пабываць на чарговай акцыі ў Беразіно Мінскай вобласці.

Для дзяцей супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі прыдумалі цікавую забаўляльную праграму: пакуль шасцікласнікі выконвалі заданні па правілах дарожнага руху, з малодшымі вучнямі праводзілі віктарыны. На пытанні кшталту «колькі колераў у святлафора?», «ці можна пераходзіць на чырвоны?», «з якога ўзросту можна катацца на роварах?» хлопцы і дзяўчаты адказвалі з упэўненасцю і амаль без памылак. Карысна жартавалі КВЗэшнікі, а добрыя парады давалі юныя інспектары руху. Напрыканцы конкурсаў дзеці глядзелі відэафільм па прафілактыцы дарожна-транспартнага траўматызму.

— Раней дні бяспекі дарожнага руху праводзіліся па краіне раз у месяц, зараз — кожны тыдзень. Дзеці заўсёды рады ўдзельнічаць у такіх мерапрыемствах, асабліва атрымліваць падарункі! — каментуе начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды ўпраўлення ДАІ Мінскай вобласці Алег Цюрын. — А яшчэ яны лепш запамінаюць, як правільна паводзіць сябе на дарогах.

— Мы робім зараз усё магчымае, каб зберагчы жыццё і здароўе нашых дзяцей, — адзначае начальнік аддзялення ДАІ Бярэзінскага РАУС Мікалай Аўтухоў. — Кожную пятніцу наведваем школы, праводзім віктарыны, летам ствараем групы, дзе вучым дзяцей Правілам дарожнага руху, дапамагаем падлеткам у падрыхтоўцы да здачы іспытаў на атрыманне вадзіцельскага пасведчання. У нас восем дзіцячых садкоў, таму заўсёды ходзім на бацькоўскія сходы, расказваем пра значнасць флікераў і спецыяльнага адзення для дзетак.

Паводле слоў намесніка начальніка упраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама Сяргея Шутава, з пачатку гэтага года на тэрыторыі Мінскай вобласці зарэгістравана 109 дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей, у якіх семнаццаць загінулі і сто атрымалі траўмы.

— Усе вы, дзеці, з'яўляецеся паўнапраўнымі ўдзельнікамі дарожнага руху, — звярнуўся да непаўналетніх Сяргей Шутаў. — Але на вас ляжыць вельмі вялікая адказнасць: вы павінны не толькі выконваць Правілы дарожнага руху, але і нагадваць нам, дарослым, каб і мы не забываліся, як трэба паводзіць сябе на дарозе.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Шануй сваё!

ТАЯМНІЦЫ ЗАХАВАНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

У кніжных крамах Беларусі з'явіўся першы том двухтомнай «Гісторыі беларускага мастацтва» (выдавецтва «Беларусь»), напісанай мастацтвазнаўцам і дырэктарам Музея старажытнай беларускай культуры Інстытута гісторыі НАН Беларусі Барысам ЛАЗУКАМ. Зараз Барыс Андрэевіч рыхтуе да выдання другі том, але яшчэ да яго выхаду першы можа быць раскуплены, настолькі кніга аказалася запатрабаванай, цікавай і, што немалаважна, прывабнай. Больш падрабязна пра яе змест і ўвогуле пра беларускае мастацтва «Звязда» вырашыла пагаварыць з аўтарам двухтомніка.

— Барыс Андрэевіч, кніга, напісаная вамі, не першая гісторыя беларускага мастацтва. Чым яна адрозніваецца ад сваіх папярэдніц?

— Першае адрозненне — знешняе. Як бачыце, кніга атрымалася яскравая, яе надзвычай прыемна трымаць у руках, гартаць, разглядаць. У ёй непараўнальна больш ілюстрацый, амаль усе — каляровыя. Другое адрозненне датычыцца адрасата. Мяркую, што кніга будзе цікавая і спецыялістам, і студэнтам, і шырокаму колу чытачоў. Шасцітомнік па гісторыі беларускага мастацтва ў нас выдаваўся з 1987 па 1994 год. З таго часу многае, асабліва ў адносінах да старажытнага часу, удакладнілася, прыведзена ў парадак. Я пастараўся гэта ўлічыць. Інакш прадставіў дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, больш грунтоўна паказаў, напрыклад, жывапіс старажытнабеларускіх княстваў, мастацтва першабытнага ладу.

Яшчэ адно важнае адрозненне датычыцца балансу эпох. У шасцітомніку тры тамы прысвечаны дакастрычніцкаму перыяду, і тры — савецкаму. У новым выданні больш справядлівая прапорцыя. Першы том распавядае пра культуру ад старажытнасці да канца XVII стагоддзя, другі ахопіць XVIII—XXI стагоддзі.

— Ад іншых даследчыкаў вас, як музейшчыка, адрозніваем больш непасрэднае, дакранальнае, калі можна так сказаць, пагружэнне ў даўніну. Якія пачуцці выклікаюць у вас творы мастацтва, калі вы трымаеце іх у руках?

— Любы артэфакт падобны на марскуюракавіну. Варта прыгледзецца, прыслухацца — і пачуеш голас часу. Калі я трымаю ў руках каменную шахматную фігурку XII стагоддзя — лодку з воінамі і адтулінамі для вёслаў, ці гляджу на роспіс Спаса-Праабражэнскага сабора ў Полацку, я заўсёды імкнуся адчуць і зразумець, як жылі людзі да нас, як яны думалі, аб чым марылі, як складаныя варункі часу, ваенныя дзеянні, адносіны нашых продкаў з Богам і Царквой ўвасобіліся ў мастацкіх творах. Разам з тым я разумею, што тое, што мы маем — далёка не ўсё з таго, што было створана лепшага і вартаснага на гэтай зямлі. На жаль, многае страчана. Тым не менш, тое што ёсць, дазваляе выбудаваць даволі цэласную карціну жыцця беларусаў за стагоддзі і тысячагоддзі да нас.

Акрамя таго, я хачу зразумець і ацаніць стылявыя працэсы развіцця нашай культуры. Фактычна гісторыя беларускага мастацтва — гэта набор прыкладаў: быў такі перыяд, у ім працавалі такія мастакі, яны стварылі такія творы. Стылявая карціна адсоўваецца на другі план. Мяне, як даследчыка стылю (Барыс Андрэевіч — аўтар манаграфіі, прысвечанай гісторыка-тэарэтычным праблемам беларускага барока. — **В.М.**), гэта не задавальняла. Таму я дазволіў сабе ў тэксце ўласныя заўвагі і назіранні, якія датычацца менавіта стылявых працэсаў, і якія павінны дапамагчы чытачу ўявіць сабе карціну мінулага жыцця цэласнай, багатай і разнастайнай.

І яшчэ. Не абавязкова трымаць у руках, дастаткова проста ўбачыць любы беларускі твор мастацтва, каб адчуць яго еўрапейскасць. Мы ніколі не выходзілі з Еўропы, у асобныя перыяды былі буйным цэнтрам еўрапейскага культурнага жыцця — вось гэтыя агульнаеўрапейскія вартасці нашай культуры я пастараўся адлюстраваць у «Гісторыі». Не толькі Беларусь як частка цэлага, але і ўзаемасувязі, уплывы, запазычанні. Цалкам натуральна, што беларускія майстры многа запазычвалі з еўрапейскіх традыцый. Той жа Францыск Скарына выкарыстоўваў здабыткі еўрапейскіх гравёрных школ. Беларускія іканапісцы, у меншай ступені праваслаўныя, у большай — уніяты, звярталіся да таго, што было напрацаванае стагоддзямі ў Еўропе. Але гэта быў не люстэркавы перанос, а творчае пераасэнсаванне, перапрацоўка. Заўсёды фактычнае вырашэнне, вобразныя трактоўкі накладваліся на характар мыслення беларускіх мастакоў і набывалі новую якасць, новае адчуванне.

— Але ж беларусы не толькі запазычвалі, але і ўплывалі…

— Безумоўна. Гэта было ў рознай ступені. Напрыклад, у другой палове XIII— VI стагоддзях, калі адыходзіць гатычная традыцыя і з'яўляюцца рэнесансныя рысы, беларускія майстры, якія былі выхаваныя на праваслаўных традыцыях, шмат стваралі ў Польшчы. У сваёй кнізе я задаюся пытаннем: як магло так адбыцца, што ў сэрцы польскай дзяржавы — у Кракаве капліцу Святога Крыжа ў кафедральным саборы Вавельскага каралеўскага замка распісваюць майстры — выхадцы з зямель Вялікага княства Літоўскага? Лягчэй патлумачыць з'яўленне больш ранніх помнікаў у Любліне, стварэнне якіх супадае з праўленнем Ягайлы. Але вавельскія роспісы сведчаць пра тое, што не толькі мы раўняліся на польскае, французскае ці італьянскае мастацтва, але і самі прыносілі вельмі важныя здабыткі ў іншыя нацыянальныя культуры.

Ужо хрэстаматыйным стаў аповед пра наш уплыў на рускую культуру. Руска-польская вайна XVII стагоддзя прывяла да таго, што частка рамеснікаў, у тым ліку мастакоў, апынулася ў рускай дзяржаве. Большасць аўтараў Збраевай палаты складалася з беларусаў. Знакамітыя іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве выканалі беларускія разьбяры, палац цара Аляксея Міхайлавіча, бацькі Пятра Першага, у Каломенскім будавалі беларускія дойліды. Яны працавалі над стварэннем зброі, упрыгажэння, мэблі царскага двара, а гэта пакінула значны адбітак у рускай культуры. Беларусы прынеслі ў рускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва тэхніку вырабу паліхромнай кафлі. Чамусьці мы забываем пра асобу Сімяона Полацкага, якога запрасілі ў Маскву выхоўваць царскіх дзяцей. Менавіта Сімяон Полацкі разам з іншымі беларускімі дзеячамі падрыхтаваў глебу, на якой расцвіло выдатнае свецкае мастацтва XVIII стагоддзя ў Расіі.

У чым самая галоўная асабліваясць беларускай культуры? У нас існуе меркаванне аб празмернай памяркоўнасці беларусаў. Гэта зусім не так. Беларусы, як кожная еўрапейская нацыя, валодаюць самым шырокім спектрам характараў, але мы заўсёды былі, ёсць і будзем, у лепшым разуменні гэтага слова, памяркоўнымі ў дачыненні да іншых нацый і культур. І наша мастацтва — яскравае таму пацвярджанне. Напрыклад, у арнаментыцы беларускага паўсядзённага абутку XII—XIII стагоддзяў прасочваецца… візантыйская традыцыя!

Цікавыя метамарфозы адбываліся з усходнімі культурамі ў нас у эпоху барока. Барока — гэта такі час, які шмат чаго перапрацоўваў у дачыненні да сваёй вобразнай сістэмы, ён не цураўся ніякіх іншых эпох, заўсёды імкнуўся да экзотыкі, да незвычайнага, да таго, каб уразіць. У XVII стагоддзі не толькі ў нас, але і ў палякаў, украінцаў была папулярная ўсходняя традыцыя. Яна прасочваецца перш за ўсё ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве: у тканінах, строях, тых жа слуцкіх паясах. У XVIII стагоддзі адбываецца кардынальная змена: цяпер больш цікавым становіцца Кітай, Японія. Традыцыя Далёкага Усходу пераймаецца ў вышэннях інтэр'ера, робяцца папулярнымі японскія кабінеты. Не толькі шырмы, посуд, тканіны, але і экзатычныя куткі. Тое ж самае мы можам убачыць і ў парках: ладзяцца спецыяльныя японскія куточкі з мініяцюрнымі вадаёмамі, выспамі, масткамі, спецыяльна вырашчанай зелянінай. Дарэчы, у беларускіх парках экзатычныя расліны з'явіліся і раней, тут былі пашыраны аранжарэі, існавалі фігарні, дзе вырошчвалі цытрусавыя, а ў летні час выносіліся ў паркі.



Фота Марыі БЕГУНКОВАЙ.

— Усё ж такі наколькі блізка да праўды можна ўявіць сабе чалавека мінулай эпохі за творам мастацтва?

— Як казаў Якаў Гурэвіч, буйнейшы даследчык сярэдневяковай культуры, у сваіх развагах і даследаваннях мы можам толькі наблізіцца да разумення часу, ментальнасці чалавека, які ў ім жыў. Напэўна, дакладна адлюстраваць гэта ў нашых словах, фільмах, музыцы, іншых формах культурнай дзейнасці немагчыма. Толькі большае альбо меншае набліжэнне.

Калі я расказваю студэнтам пра мастацкія помнікі, я заўсёды падкрэсліваю, што іх стваралі рэальныя людзі, якія жылі ў адпаведны час, думалі, марылі, кахалі, пакутавалі, былі шчаслівымі, ці не зусім… Калі я праводжу экскурсію ў нашым музеі, у зале, дзе знаходзіцца сакральнае мастацтва, іканапіс, абразы, я, пасля аповеду пра экспанаты, часта кажу наведвальнікам: «А зараз спыніцеся, азірніцеся. Уявіце сабе, колькі тысяч людзей стаялі перад гэтымі абразамі, колькі тысяч малітваў прагучала перад гэтымі творамі мастацтва». І людзі пранікаюцца, у іх мяняюцца твары, вочы, нават голас.

Вельмі добра, што зараз людзі цягнуцца да хрысціянства, бо праз веру ў характар нацыі пранікае духоўнасць. Я не люблю пытанняў адносна сябе, вернік я, альбо не. Але чалавек, які займаецца мастацтвам, не можа не быць вернікам.

— Барыс Андрэевіч, як, моцна на ваш погляд, мы адрозніваемся ад тых беларусаў, якія будавалі Сафійскі сабор у Полацку альбо насілі крыжы-энкалпіёны, пра якія вы расказваеце ў сваёй кнізе?

— Думаю, не. Ведаеце, повязь часоў, нягледзячы ні на якія рэвалюцыі, войны і катастрофы, захоўваецца. Ёсць у нашым музеі неалітычная кераміка, на якой арнамент размешчаны на вусці сасудаў. Гэта мае сакральны сэнс ахоўніцтва, засцярогі ежы, якая ў тым сасудзе знаходзілася. Праз тысячагоддзі беларускія жанчыны вышывалі на сваёй вопратцы арнамент у аналагічных месцах — на каўняры, рукавах — там, дзе адкрывалася цела, і меў ён такі ж ахоўны сэнс.

Безумоўна, кожная эпоха фарміруе свае погляды. Напэўна людзі, якія жылі ў X—XII стагоддзях, ацэньвалі сваё акружэнне па-свойму. Я не хачу сказаць — інакш. Тэхнагенная цывілізацыя з сучаснымі сродкамі камунікацыі, даступнасці да ўсяго, выклікае ноту адчужанасці, абыякавасці. Калі вы слухаеце оперу па радыё — гэта адно, і зусім іншае — калі ў тэатры. Таму нашы пачуцці не настолькі аголеныя, як у нашых продкаў.

— Ды і ахоўны арнамент мы ўжо не вышываем на каўнярах…

— Не кажыце. Экспедыцыі, якія ладзіць музей, выяўляюць цікавую тэндэнцыю: нягледзячы на тое, што тэхніка, механізацыя і аграрагарадкі прыйшлі ў нашу вёску, і, дзякуй Богу, вясковыя жыхары жывуць не горш за гараджан, беларуская традыцыйнае адзенне і культура там адраджаюцца. Сёння за добры тон лічыцца, калі кабета з'явіцца ў царкве ў строі з нейкім народным матывам.

Тое, што зараз наша грамадства звяртаецца да гісторыі, да вытокаў сваёй культуры і мастацтва — вельмі добра. І, зноў жа, важная заслуга ў гэтым хрысціянства. Памятаеце «Партызанскую Мадонну» Савіцкага? Ён першы ў 60—70-х «адкрыў» у савецкім мастацтве, хай сабе і завуаліравана, хрысціянскую тэму. У савецкія часы хрысціянства зводзілася да рэлігіі, але гэта больш, чым рэлігія — гэта ўвасабленне глыбокай маральнасці цывілізацыі, і не толькі еўрапейскай, якая праз тысячагоддзі дайшла да нашага часу. Хрысціянства настолькі шматграннае, складанае і ўсеабдымнае, што ў ім кожны можа знайсці для сябе тое, што варта менавіта для яго адчування асобы. Сучасныя мастакі, не абмежаваныя ніякімі правіламі і канонамі, ніякай цэнзурай, кіруюцца толькі ўласнымі маральнымі прынцыпамі. І не важна, звяртаецца мастак да рэалістычных вобразаў, ці ідзе шляхам фармалістычных пошукаў, але ў яго творы ёсць не толькі хрысціянскія вобразы, а і іх адпаведнае часу прачытанне.

Такім чынам, праз мастацтва, праз вывучэнне яго гісторыі мы бачым і повязь часоў, і тое, што нас адрознівае ад папярэдніх пакаленняў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Валянцін ТАРАНАЎ:

Нетрадыцыйная медыцына

«ТРЭБА МЕЦЬ СВАЮ ЖЫЦЦЁВУЮ ФІЛАСОФІЮ І РАДАВАЦЦА ДАБРУ»

Артыкулы і інтэрв'ю горацкага біяэнергатэрапеўта Валянціна Таранава нязменна выклікаюць інтарэс чытачоў «Звязды». Валянцін Мікалаевіч — доктар нетрадыцыйнай медыцыны, магістр біяэнергатэрапіі, вельмі адукаваны чалавек. Сёння ён закранае некалькі актуальных праблем, якія звязаны са здароўем і добрым самаадчуваннем чалавека.

Як пазбягаць стрэсаў. Гэтаму можна навучыцца — ёсць школы і методыкі. Праблемай супакаення свядомасці займалася шмат навукоўцаў.

Што ж рабіць, калі ўсё кіпіць у мазгавым камп'ютары, калі думкі чапляюцца адна за адну і адчапіцца ад іх немагчыма? А потым хранічнае напружанне перарастае ў стан страху. І чалавек беззваротна губляе сваю жыццёвую энергію і трапляе ў стан глыбокай дэпрэсіі. А за гэтым, як правіла, ідуць сур'ёзныя хваробы.

Між тым, усё пачалося з дробязяў: пачаў з макавага зерня трывогі і давёў да вялізных памераў. А потым гэта лухта пачала разбураць самога чалавека.

У якасці метаду барацьбы прапаную звычайныя жыццёвыя філасофіі. Кожны можа выпрацаваць сваю праграму, прыняць за аснову і потым ёй кіравацца. Сёння ў кнігарнях паліцы трышчаць ад рэкамендацый у гэтым кірунку.

Дарэчы, у свой час праблему жыццёвай філасофіі часткова вырашала рэлігія. Чалавек ішоў у царкву на споведзь, нібыта самачышчаўся, умацоўваў сваю веру, атрымліваў упэўненасць у заўтрашнім дні.

Пакуль дастойнага замяняльніка гэтаму так і не знайшлі. Як у Высоцкага: «Не ў царкву, і не ў кабак. Нічога не святое». А адсутнасць гэтай святасці, трывалай жыццёвай філасофіі, як правіла, робіць чалавека безабаронным у любой стрэсавай сітуацыі.

Навошта разумець мэту свайго жыцця. Унутраная жыццёвая філасофія павінна быць касцяком чалавека. Ён павінен разумець мэту свайго жыцця і светаўладкавання.

Ёсць такая думка, што чалавек памірае не ад хваробы, а ад нейкага тайнага, унутранага рашэння не супраціўляцца хваробе. Аднак наяўнасць нейкай праграмы, мэты на гэтым жыццёвым адрэзку чалавека мабілізуе ўсе сілы на прадаўжэнне яго жыцця.

Напрыклад, мая бабуля, якая памерла ў 86 гадоў. Калі ёй да смерці заставалася два тыдні, яна з рыдлёўкай калупалася ў агародзе. Аказалася, што там не перакапалі паўсотні. «Навошта ты гэта робіш?» — «Не магу, калі агарод не ў парадку». І пакуль не навяла парадак, старая не супакоілася.

Безумоўна, праблема ўзаемаадносінаў нашых продкаў з зямлёй, крыніцай іх жыцця — гэта цэлая філасофія, якую ўжо мы не ў стане зразумець. Але самае галоўнае — ёсць жыццёвая праграма і мэта. Калі мэты няма, то чалавек дэзарыентуецца ў жыццёвым асяроддзі. Ён не ведае, чаму яму радавацца, а чаму засмучацца, куды рухацца?

Як змагацца з дрэннымі думкамі. Любымі метадамі. Нават цікавае хобі можа адцягнуць увагу. Яшчэ Хрыстос казаў, што, на жаль, чалавек больш схільны да горшага, чым да лепшага. Такая ў нас свядомасць. Але калі лепшае пастаянна трымаць у полі зроку, заўважаць яго і памятаць пра яго, то ўвага чалавека будзе адцягвацца ад дрэнных думак.

Трэба проста памятаць, што нават калі ўсё страчана ў жыцці, застаецца самае галоўнае — само жыццё. Калі мы пужаем сябе страхамі наконт чаканых негатыўных момантаў, якія насамрэч могуць ніколі і не спрадзіцца, мы забываемся, што галоўную каштоўнасць мы маем.

Трэба радавацца самому працэсу жыцця! Так, сонейка свеціць раніцай, жывы і здаровы — радуйся. Таму што другога жыцця не будзе. І нельга марнаваць час — пакутаваць штодня, охаць і ахаць.

Трэба вучыцца цаніць і любіць усё добрае. Хочацца песню заспяваць — калі ласка. Дарэчы, пра песні: рэзанансная медыцына сёння ва ўсім свеце на пад'ёме. Мы рэзаніруем сваім голасам і аднаўляем жыццёвую энергію. Таму што ў прыродзе няма аднабаковай сувязі. Нашы продкі спявалі, калі ішлі на працу і з яе. Гэта вельмі карысна.

Увогуле мадэляванне хоць бы знешняга дабрабыту і камфорту адбіваецца на ўнутраным стане. Нават калі чалавеку самаадчуванне не дазваляе спяваць і танцаваць, трэба перакрочыць праз гэта, і карэкцыя, паляпшэнне непазбежныя.

Як пазбавіцца ад лішняга негатыву. Што ж, калі шчыра, мы ўсе добра ўмеем крыўдаваць і скардзіцца на жыццё. А яшчэ і іншых падагравацъ, расказваючы сябрам і суседзям пра свае непрыемнасці.

Для таго, хто спрабуе пераласці сваю негатыўную інфармацыю на плечы іншага, гэта добра. А для суразмоўцы? Натуральна, адмоўнае ўздзеянне. І гэта трэба дакладна разумець. У чалавека і так сваіх думак праз край, а тут яго нагрузілі яшчэ болей.

Адна справа — параіцца, як паступіць у складанай сітуацыі, і зусім іншая — схапіць сяброўку за рукаў і скардзіцца, што ўсё дрэнна. Ад такой інфармацыі чалавек стамляецца: ён уваходзіць у негатыўнае інфармацыйнае поле, і гэта інфармацыя пачынае працаваць ужо ў яго сістэме.

Таму лепшая абарона: пазбягаць такіх кантактаў. Калі немагчыма, то сказаць: «Выбачай, я спяшаюся, мне трэба бегчы…» Альбо самому пераключыцца на станоўчыя думкі, а той гук няхай ідзе і сэнс вас не кранае. Адзіная ўмова — не глядзець у вочы таму, хто вывальвае на цябе негатыў, а любавацца на кветачкі ды лісцікі.

Як не стаць працаголікам. Гэта вельмі сур'ёзная праблема. Яе сёння вывучаюць і прыходзяць да высновы, што працаголізм — гэта небяспечная форма псіхічнага расстройства. Чалавек, які становіцца рабом сваёй працы, губляе арыентацыю ў прасторы і сэнс жыцця.

У звязцы з гэтым часта ўзгадваюць сіндром япі, маладых менеджараў. Калі маладыя людзі, поўныя сіл і энергіі, спрабуюць суткамі, без выхадных і водпускаў, няспынна працаваць. Так, яны дамагаюцца вынікаў. Аднак з цягам часу гэтая патрэба становіцца пераважнай і займае ўсё жыццё чалавека.

Але нійкая сістэма не можа пастаянна знаходзіцца ў стане напружання. Паступова яна становіцца непрыдатнай і з'яўляюцца паломкі — хваробы. Таму працоўны рытм павінен быць дакладным і наладжаным, як і біялагічны рытм чалавека. Калі надышоў выхадны дзень — значыць, ён такім і павінен быць. І ў водпуску трэба адпачываць.

Так, мы можам мабілізаваць сябе і ў стане высокай баявой гатоўнасці прапаўзці яшчэ год, два, тры. Але гэта раўназначна таму, што трымаць салдата на варце нязменна. І ён ўрэшце проста ўпадзе.

Пра зносіны з медыкамі. Нізка кланяюся медработнікам. Я разумею, наколькі гэта нялёгкая праца — пастаянна знаходзіцца ў негатыўным інфармацыйным полі. Да іх людзі прыходзяць не з радасцю і ўсмешкай на твары, а з цяжкімі праблемамі. І бясшкодна для самога доктара гэта не праходзіць. Па працягласці жыцця ўрачы, асабліва хірургі, знаходзяцца ў адной групе з шахцёрамі.

Што датычыцца прыёму пацыентаў, на які часта скардзяцца — маўляў, часу няма, доктар увесь час піша і гэтак далей, то паводле нарматываў, на аднаго наведвальніка прыпадае пэўная колькасць хвілін, і яна невялікая. За тыя 10—15 хвілін можна толькі пазнаёміцца. А ці можна вывучыць гісторыю хваробы, знайсці яе першапрычыны, якая можа палягаць у сацыяльнай сферы — сям'і, працы, быце?.. Пра гэта рэдка хто пытаецца, на жаль. А там можа быць, напрыклад, бацька п'яніцам, муж скандалістам і сын-падлетак з прэтэнзіямі. І хімічным шляхам, таблеткай альбо парашком, гэтую праблему не вырашыць.

Таму мне падаецца, што чалавек, які ідзе да ўрача, у першую чаргу мае патрэбу ў цёплым добрым слове, у разуменні сваіх праблем. Каб медык расклаў хваробу на складнікі і паказаў, што тут няма надта сур'ёзнай праблемы і нагоды для самаразбурэння. На жаль, у доктара на гэта не стае часу. Ды і не мае ён права выходзіць за межы методык лячэння канкрэтнага захворвання.

Шмат гавораць пра тое, што трэба мяняць падыходы афіцыйнай медыцыны да чалавека. Можа, як варыянт — хатні доктар, які б вёў сям'ю з пакалення ў пакаленне,ведаў слабыя месцы і спадчынныя хваробы, да з'яўлення якіх трэба рыхтавацца загадзя. Аднак пакуль чалавек разглядаецца ў адрыве ад спадчынных фактараў і асяроддзя пражывання.

Пра анкалогію і яе прафілактыку. Можна прывесці дзесяткі адмоўных фактараў, якія спрыяюць з'яўленню анкалогіі. Але я мяркую, што ў аснове анкалагічных захворванняў палягае страта жыццёвай энергіі, якая прыводзіць да аслаблення іммунай сістэмы. Губляецца кантроль арганізма за ніякаснымі клеткамі: «кілеры», якія павінны іх «адстрэльваць», не спраўляюцца са сваёй працай.

Якая тут можа быць прафілактыка? Добры псіхаэмацыйны стан чалавека. Таксама нармальныя рацыён харчавання, рэжым жыцця, біярытмы. Усё гэта працуе на прафілактыку анкалогіі. Можна, зразумела, пазбягаць канцэрагенаў: выключыць курэнне, празмернае спажыванне алкаголю, імкнуцца жыць і адпачываць у экалагічна чыстых мясцінах… Але я ўсё ж упэўнены, што ў аснове анкалогіі палягае не біяхімічная праблема, а энергетычная. І біяхімія — гэта ўжо другасны фактар.

Мяне людзі часта пытаюцца, што трэба рабіць хвораму на анкалогію: шукаць экстрасэнсаў альбо ісці ў афіцыйную медыцыну. Адназначна — трэба ісці да медыкаў. Таму што калі ракавая клетка выяўлена, яе трэба выдаляць. І метастазы, якія могуць быць. А вось ужо далей, калі курс лячэння пройдзены, трэба выкарыстоўваць і метады нетрадыцыйнай медыцыны — для падняцця жыццёвага патэнцыялу і ўмацавання імуннай сістэмы.

Мне з анкахворымі даводзілася працаваць, і я шчыра скажу, што гэта небяспечны занятак. Большасць экстрасэнсаў баяцца негатыву, які нясе гэта небяспечная для жыцця хвароба. Сістэмнай працы па карэкцыі хворых праз біяэнергетыку і не было. Я вывучаў досвед шмат якіх лекараў. Напрыклад, Джуны: ёй патрабавалася да 15 сеансаў на дзень, каб дасягнуць нейкага выніку. Калі абмежавацца нават адным сеансам у некалькі дзён, то ёсць кароткачасовы эфект. Але які будзе сістэмны вынік? Гэты накірунак трэба вывучаць пад кантролем спецыялістаў афіцыйнай медыцыны.

І трэба падтрымліваць людзей. Мне падаецца, што трэба ўвесці пасады псіхатэрапеўта альбо псіхолага ў анкалагічных аддзяленнях, дзе людзі ляжаць і ўсе іх думкі — толькі аб адным. Чалавек сябе накручвае, і хворыя адзін аднаго цягнуць у вір поўнай безвыходнасці. А ім хочацца, каб іх супакоілі, каб сказалі яшчэ раз, што шанц ёсць. І каб яны паверылі. Калі пачынаеш так рабіць, то хворыя адклікаюцца на ўвагу, вочы цяплеюць, паляпшаецца сон. Тут патрэбна сістэмная праца.

Пра шарлатанства і народных лекараў. Гэта сур'ёзнае і складанае пытанне, на якое адназначна адказаць немагчыма. Напершае, незразумела, што адносіць да шарлатанства, а што не?

Калі бабуля дае хвораму прастую ваду і пераконвае яго, што менавіта гэта малекула вады як біяхімічны прадукт зробіць на арганізм моцнае прафілактычнае ўздзеянне — гэта нібыта шарлатанства. А калі падысці да сітуацыі з іншага боку, з разуменнем энергаінфармацыйных працэсаў, веры чалавека і яго ўнушэння? Бабуля падае ваду, упэўнена глядзіць у вочы чалавеку і ён верыць ёй, і яму становіцца лепей, ёсць канкрэтны вынік — і гэта ўжо не шарлатанства.

А што наконт плацэба? Ва ўсім свеце павялічваецца вытворчасць гэтых таблетак-пустышак. Напрыклад, да доктара прыходзіць чалавек, які мае ўзроставыя паталагічныя змяненні. Натуральна, што медык разумее: няма такіх таблетак, каб вярнуць хворы орган у ранейшы малады здаровы стан. Але чалавек просіць дапамогу і лекаў, ён па гэта прыйшоў. І доктар дае яму плацэба. Ці дапамагае? Часта здараецца, што так, дапамагае. І як назваць гэтага доктара — шарлатанам? Паводле логікі, гэта бессаромны падман. Але падман дзеля дабра, бо ён дапамог хвораму.

Немагчыма правесці дакладную мяжу: вось гэта шарлатанства, а гэта — вылячэнне. І не выпадкова гавораць: па вашай веры і аддасца вам. Калі хворы паверыў у дзеянні бабкі альбо ў таблеткі — няхай яму гэта дапаможа.

Нельга адмаўляць, што на чалавека можна ўздзейнічаць праз энергаінфармацыйны складнік. І ўжо навука не адмаўляе, што хваробы нараджаюцца на тонкаматэрыяльным узроўні, у нашым эфірным двайніку. А ўжо потым выяўляюцца ў канкрэтных органах. Калі так, то чаму ж нельга папярэдзіць хваробу, пакуль яна не дабралася да нашага арганізма?

Як ужываць лекі. Ёсць людзі, якія катэгарычна адмаўляюцца ад хімічных лекаў. А іншыя толькі ў таблетках бачаць панацэю і ядуць іх жменямі.

Я тут параіў бы, як і ў іншым, трымацца залатой сярэдзіны. Не трэба станавіцца наркаманам на хімічных прэпаратах. Тут з'яўляецца псіхалагічная залежнасць ад лекаў. Чалавеку падаецца, што калі ён не прыме лекі, то яму стане горш. Тады, здараецца, сваякі просяць дапамагчы і растлумачыць чалавеку, што не трэба есці таблеткі вялікімі порцыямі.

Ведаеце, часта звычайную рэакцыю на навакольнае асяроддзе, на надвор'е мы прымаем за хваробу. Але гэта розныя рэчы. Напрыклад, сёння мяняецца атмасферны ціск і мы не можам не адчуваць гэтага. Адна палова адчувае дыскамфорт пры яго памяншэнні, іншая — пры павелічэнні. І нічога дзіўнага ў гэтым няма. Гэта асабівасці вегетатыўнай нервовай сістэмы.

Але разам з тым зусім адмаўляцца ад лекаў я не раю. Хімічным шляхам можна і нават трэба сябе карэктаваць, калі чалавек адчувае вялікі дыскамфорт і моцны боль. Тады не трэба пакутаваць і перагружаць нервовую сістэму, а лепей прыняць лёгкі з разумных межах.

Пра навучанне здароваму ладу жыцця. Доктар заняўся здараўленнем чалавека, і ёсць вынік — бальчка заціхла. І я часта думаю: а што рабіць далей?

Чалавека трэба вучыць з нуля — як жыць, думаць, харчавацца, зносіцца ў грамадстве… У чым увогуле сэнс здаровага ладу жыцця. Таму што цяпер практычна ўсе высілкі традыцыйнай і нетрадыцыйнай медыцыны губляюцца, калі чалавек застаецца сам-насам з сабой. Мы лянівыя і не хочам сачыць за сваім здараўем.

У нас нізкі ўзровень культуры здараўя. Мы гэтаму чалавека нідзе не вучым. Даўно трэба ўвесці ў школах і тым больш у ВНУ. Сёння выпускнік нашай Горацкай сельгасакадэміі добра ведае, як збалансаваць кармы для свіней і кароў. А як накарміць чалавека?

Самаадукацыяй займаюцца ў лепшым выпадку два чалавекі з дзесяці. А 4—5 з гэтай дзесяткі ўвогуле не могуць працаваць сістэмна з сабой. Калі хвароба штурхнула ў плечы — ён робіць. А калі праблема адышла, вастрыні няма — ну, маўляў, як-небудзь пражывём. Гэта няправільна.

Пра галоўную задачу. Супакоіцца ў гэтым жыцці — гэта першае. Пераасэнсаваць свае прырытэты і мэты.

Ведаеце, мы на постсавецкай прасторы, на маю думку, залішне палітызаваныя. Нас часам больш хвалюе, чым займаюцца нашы кіраўнікі альбо як там ідзе вайна ў чужой краіне, чым ўласныя надзённыя клопаты. Мы спрабуем унікаць у глабальныя праблемы і горача іх абмяркоўваем замест таго, каб думаць пра свой дабрабыт, сям'ю і працу.

Трэба рацыянальна выкарыстоўваць сваю псіхічную энергію, не хвалявацца з-за дробязяў. Праз разуменне сэнсу жыцця, устойлівую жыццёвую філасофію, уменне знаходзіць радасць у малым.

Найвышэйшы пілатаж — гэта радавацца цяжкасцям. А мы часам і радасцяў не бачым і пераўтварэмся ў вечна незадаволеную бурклівую істоту. Таму я раю ўсім навучыцца радавацца жыццю!

Запісала Ілона ІВАНОВА.

Будзьце пільнымі!

Восень. «Дамушнікі» пацягнуліся ў сталіцу

Вал кватэрных крадзяжоў абрынуўся ў апошнія дні на беларускую сталіцу. Калі ў сярэднім у Мінску штодзень фіксуецца 9 злачынстваў такога кшталту, то зараз гэты «паказчык» павялічыўся больш чым удвая. Як патлумачыў намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі і спецыяльнай міліцыі ГУУС Мінгарвыканкама Раман Мельнік, вераснёўскі пік актыўнасці «дамушнікаў» (так называюць кватэрных злодзеяў спецыялісты) мае сезонную заканамернасць: злачынцы вярнуліся з цёплых краёў, дзе падчас адпачынку патрацілі здабытыя несумленным шляхам грошы, і зараз папаўняюць свой «бюджэт». Паводле слоў прадстаўніка сталічнай міліцыі, рэзкі ўсплёск кватэрных крадзяжоў таксама адбываецца напрыканцы студзеня і красавіка. Такая зладзейская заканамернасць назіраецца ў Мінску на працягу апошніх 5 гадоў.

А ўвогуле, як падкрэсліў Раман Мельнік, сёлета адзначаецца змяншэнне (амаль на 5 працэнтаў) колькасці кватэрных крадзяжоў. За 8 месяцаў гэтага года зарэгістравана 2678 падобных злачынстваў.

Дзіўна, але амаль палова зладзеяў трапілі ў чужыя кватэры фактычна бесперашкодна. Хтосьці з гаспадароў схаваў ключ у паштовай скрынцы ці пад дываном, некаторыя ахвяры самі запрасілі ў госці зладзеяў для сумеснага распіцця спіртных напояў, а нехта проста не зачыніў за сабою дзвярэй. Такім вось шляхам свабоднага доступу ў Мінску сёлета было ўчынена 1347 кватэрных крадзяжоў.

Друг

ПАНЯДЗЕЛАК, 1 КАСТРЫЧНІКА

5.35, 16.40 Серыял «Права на шчасце».
6.20, 7.05, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.45, 7.45, 18.50, 0.30 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00,19.00, 0.35 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам!
9.05, 19.55 Серыял «Група Zeta».
10.00 «Славянскі базар у Віцебску-2007».
10.55, 17.40 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.10 Камедыя «Шаленыя скачкі».
15.35 Здароўе.
14.30 Nota Bene.
15.15, 19.25 Навіны рэгіёна.
15.30 Зорны старт. Дзённік дзіцячага Еўрабачання.
15.40 Культурныя людзі.
16.10 Фігуры.
19.35 Час спорту.
21.00 Панарама.
21.40, 1.55 Серыял «Медыум».
22.35 Баявік «У цені».
0.55 «Тайны забытых пераможцаў». «Пераадоленне».
1.25 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэасаполіс.

6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Пакуль усе дома».
7.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 Маст фільм «Узброеныя і небяспечныя».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 3.20 Навіны спорту.
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Мая цудоўная няня».
13.40 «Федэральны суддзя».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
16.15 Рэаліці-шоў «Тры халасцякі».
18.20 «Зачараваны». Серыял.
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 «Выбар».
22.00 «След».
23.20 «Злачынствы стагоддзя».
23.55 Тэорыя неверагоднасці. «Проста лянота».
0.40 «Фабрыка зорак «дома».
1.10 «Забойная сіла». Серыял.
2.05 «Каварства гор». Серыял.
Тэхнічная прафілактыка з 3.30 да 5.00.
5.05 «Няхай гаворыць» з Андрэем Малахавым.

5.45 «Жарт за жартам».

7.00 Ранішняя падзарадка.
8.00, 17.30 Серыял «Белінда».
8.50 «Абліччы Еўразіі — дыялог культур». «Выпраменьванне кахання».
9.20 Добрыя навіны.
9.50 У гэты дзень.
9.55 Маст. фільм «На зыходзе лета».
11.10 «Акцэнт на часе». Дак. фільм пра дырыжора Аляксандра Анісімава.
11.45, 18.30 Серыял «Расплата за грахі».
12.25 Тэлебарометр.
13.00 Серыял «Свой чалавек».
13.55 «Школа рамонту».
14.45 Усё пра небяспеку.
15.20 Дак. серыял «Паляўнічая адысея».
15.55 Мультсерыял «Добрай раніцы, Мікі Маўс!».
16.25 Серыял «Школа першых ракетак».
16.45 Ядзім дома.
19.30 Беларуская часінка.
20.35 Калыханка.
20.55 Серыял «Ярмак». 1-я серыя.
22.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
23.05 Хакей. Формула гульні.
23.40 Баскетбол.

6.00, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20 «З чаго пачынаецца раніца».
7.30 «Тыдзень з Аленай Хаданонак».
8.40 «Вялікае снеданне».
9.15 «Прыватныя гісторыі».
10.00 «Спартыўны тыдзень».
10.40 «Культурнае жыццё».
11.05 «Рэбека». Серыял.
12.00, 18.25 «За ўсё табе дзякую-2». Серыял.
13.00 «Ёсць кантакт».
13.50 «Фантастычныя гісторыі».
14.45 «Іншапланецяне». Мультсерыял.
15.10 «Элен і рабяты». Серыял.
15.50 «Народжаныя ў СССР».
16.50 «Бабскі бунт».
17.30 «Званая вячэра».
20.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малыш».
20.25 Маст. фільм «Канцервы».
22.55 «Закон і крымінал».
23.00 «Сталічны футбол».
23.30 «Гучная справа».
0.20 «Ваенная тайна».



4.00, 5.00, 6.00, 7.00 Зараджайся!
4.30, 14.00 Серыял «Маўглі».
5.30 Вясельныя вар'яцтвы.
6.30 Удачная пакупка.
7.30 «Разам».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 Казахстан: старонкі гісторыі.
9.00 Спецыяльны рэпартаж.
9.30 Хіт-экспрэс.
10.30 Серыял «Раксалана».
12.00, 22.25 Студыя 60х90.
12.15, 22.30 Маст. фільм «Кароль-алень».
13.45 Урокі англійскай мовы.
15.00 Дак. серыял «Тайны падарожжаў».
16.00 «Гадзіна суда». Справы сямейныя.
17.00 Цацкі для дарослых.
18.10 Серыял «На віражы».
19.15 «Цік-так».
19.30 Скрыжаванне «Пра каханне».
20.00 Рэспубліка — сёння.
22.00 Акцэнты.

7.00 «Сад і агарод».
7.05, 21.05, 23.15 «Метэапрагноз».
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.20 Серыял «Эркюль Пуаро».
8.45 «К-гульня».
9.00 «Клуб 700».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50 Серыял «Чынгіз-хан».
11.00 Маст. фільм «Чумавая пятніца».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
17.00 «Мультпарад».
17.10 Маст. фільм «Аванturысты».
18.55 «Навіны кіно».
19.00 «Трукачы Галівуда».
19.30 «Сад і агарод — плюс».
19.45, 21.10 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.50 Серыял «Нікіта».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.15 Трылер «Гатака».



7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.05 «Брацкая ГЭС».
10.00 «Рэвізор».
10.30 «Спецыяльны карэспандэнт».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 14.10 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50 «Фітыль».
12.50 Серыял «Пяшчотная пачвара».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.30 Маст. фільм «Мужчына павінен плаціць».
16.00 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.20 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.45 Серыял «Анёл-ахоўнік».
19.45 Добрай ночы, малышы!
19.55 Серыял «Віола Тараканава. У свеце злачынных страсцяў».
21.00 Серыял «Целаахоўнік».
22.00 Серыял «Закон і парадак».
23.10 Весткі+.
23.30 «Мой сярэбраны шар. Лідзія Смірнова».
0.30 «Сумленны дэтэктыў».
1.00 «Сінемманія».

6.00 «Сёння раніцай».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.00 «Агляд».
9.30 «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
10.20 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.15 «Следства вялі...».
13.25 Гістарычны фільм «Аляксандр Неўскі».
15.30, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Камедыя «Ландыш серабрысты».
19.45 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела».
20.50 Серыял «Абарона Красіна». 1-я серыя.
22.30 Серыял «Кат». 1-я серыя.

Аўтар спрабуе разабрацца ў праблеме кâта і ахвяры, нянавісці і справядлівасці.

23.35 «Маскі-шоў».
0.05 «Прафесія — рэпарцёр».



5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
7.50, 10.15, 0.25 Пятроўка, 38.
8.00 Маст. фільм «Тры таполі на Плюшчысе».
9.40 «Мужчынская чароўнасць Алега Яфрэмава». Дак. фільм.
10.50 «Пастскрыптум».
11.55 Момант ісціны.
12.45 Лінія абароны.
13.50, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
13.55 «Дэтэктыўныя гісторыі». «Аперацыя «Вышук».
14.30 «У цэнтры падзей».
15.30 Новая «Часінка».
16.55 Дзелавая Масква.
17.15 Наташа Каралёва ў праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
17.50 «Гарадскі раманс». Серыял.
18.55 «Маскоўскія профі». Дыджэі.
20.05 «Зорка эпохі». Серыял.
21.10 «Закон Вольфа». Серыял.
22.10 «Сто пытанняў даросламу».
23.05 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.35 «Збор твораў». Вакол свету з Хасэ Карэрасам.
0.45 «Чыста англійскае забойства». Серыял.
2.25 «Воін». Баявік.
4.35 Мультфільм.

9.30 Мотаспорт.
10.00 Суперспорт. Чэмпіянат свету.
11.00 Лёгкая атлетыка. Залаты гран-пры.
12.30, 17.15 Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Фінал.
14.00 Фехтаванне.
15.00 Тэніс. Турнір WTA.
16.15 Веласпорт. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
18.45 Футбол. Го-о-о-ол!!!
19.00, 1.00 Футбол. Еўрагалы.
20.00 Вось гэта дзіва!!!
20.30 Снукер. Зала славы.
21.30 Самыя дужыя людзі планеты.
22.00 Байцоўскі клуб.
2.00 «Eurosport Buzz».

ФІЛЬМ ДНЯ

ТБЦ 2.25 «ВОІН» (КІТАЙ—ПАЎДНЁВАЯ КАРЭЯ, 2001 г.)

1375 год. Кітайскую імперыю раздзірае варожасць дзвюх дынастый, якія прэтэндуюць на трон. Атрад карэйскіх воінаў выратоўвае захопленую ў палон кітайскую прынцэсу. Яны павінны даставіць яе да імператара, пераадолеўшы пазбаўленую жыцця пустыню і полчышчы атакуючых ворагаў.

Рэжысёр — Кім Сун-Су. **У ролях:** Джан Цзы-Йі, Джун Ву-Сун, Ан Су-Джы.

АЎТОРАК, 2 КАСТРЫЧНІКА



5.35, 16.45 Серыял «Права на шчасце».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.55, 23.40 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.45 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Час спорту.
9.05, 19.55 Серыял «Група Zeta».
10.00 Славянскі базар у Віцебску-2007.
10.55, 17.45 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.10 Камедыя «Чалавек ніадкуль».
13.40 «Людзі на граніцы». «Грыбны рай».
14.05 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.50 Nota Bene.
15.15, 19.25 Навіны рэгіёна.
15.30 Серыял «Клава, давай!». 1-я серыя.
15.50 Серыял «Блізняты». 1-я серыя.
19.35 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Манчэстэр Юнайтэд»—«Рома».
0.10 Дзень спорту.
0.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд.
1.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Штутгарт»—«Барселона».

Тэхнічная прафілактыка ў Жлобіне, Магілёве.
6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05, 15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
7.05 «Наша раніца».
9.05 Чакай мяне.
10.00 «Модны прыгавор».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 3.20 Навіны спорту.
11.10, 21.05 Серыял «Не радзіся прыгожай».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Мая цудоўная няня».
13.40 «Федэральны суддзя».
14.30 «Кантрольная закупка».
16.15 Дэтэктыў «Супермаркет».
17.15, 5.05 «Няхай гаворыць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Зачараваны». Серыял.
18.55 «Таццянін дзень». Серыял.
20.00 Час.
22.10 «След».
23.30 Да юбілею Алега Яфрэмава. Фільм Леаніда Парфёнава «Вечны Алег».
0.30 «Фабрыка зорак «дома».
1.05 «Забойная сіла». Серыял.
2.00 «Каварства гор». Серыял.
3.25 Маст. фільм «Кашмар на вуліцы Вязаў».
5.45 «Жарт за жартам».

7.00 Ранішняя падзарадка.
8.00, 17.30 Серыял «Белінда».
8.50 «Абліччы Еўразіі — дыялог культур». «Феномен Сатпаева».
9.25, 16.45 Ядзім дома.
9.55 Хакей. Формула гульні.
10.25 У гэты дзень.
10.30 Маст. фільм «Вогненны сралок».
12.00, 18.30 Серыял «Расплата за грахі».
12.50 ПРАсоўванне+.
13.05 Серыял «Свой чалавек». Заключная серыя.
14.00 Школа рамонту.
14.50 Святло далёкай зоркі. Пётр Макаль.
15.25 Дак. серыял «Паляўнічая адысея».
15.55 Мультсерыял «Добрай раніцы, Мікі Маўс!».
16.25 Серыял «Школа першых ракетак».
19.30 Беларуская часінка.
20.35 Калыханка.
20.55 Серыял «Ярмак».
22.00 «Іншыя». Грэх прывабнасці.
22.30 Хакей. НХЛ. Лос-Анджэлес—Анахайм.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20 «З чаго пачынаецца раніца».
8.50 «Таямніцы Бермудскага трохвугольніка». Дак. фільм.
9.15 «И Вам при встрече я скажу...». МТФ «Галасы гісторыі» ў г. Волагда.
10.00 «Сталічны футбол».
10.40 «З дакладных крыніц».
10.55 «Наша справа».
11.05 «Рэбека». Серыял.
12.00, 18.25 «За ўсё табе дзякую 2». Серыял.
13.00 «Сталкер».
13.50 «Прафесійны бокс».
14.50 «Іншапланецяне». Мультсерыял.
15.10 «Элен і рабяты». Серыял.
16.00 «Далёкія сваякі».
16.50 «Бабскі бунт».
17.30 «Званая вячэра».
20.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малыш».
20.30 «Аўтапанарама».
20.50 «Салдаты 13». Серыял.
22.00 «Рэпарцёр СТБ».
22.55 «Закон і крымінал».
23.00 «Гарачы лёд».
23.30 «Надзвычайныя гісторыі».
0.20 «Рэдакцыя». Серыял.



4.00, 5.00, 6.00, 7.00 Зараджайся!
4.30, 14.00 Серыял «Маўглі».
5.30 Удачная пакупка.
6.30 Удачная пакупка.
7.30, 18.10 Серыял «На віражы».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 Сямейны альбом.
9.00 Рэспубліка — сёння.
9.30 Ведаем рускую.
10.30 Серыял «Раксалана».
12.00, 22.25 Студыя 60х90.
12.15, 22.30 Маст. фільм «Манчжурскі варыянт».
13.45 Урокі англійскай мовы.
15.00 Застацца ў жывых.
16.00 «Гадзіна суда». Справы сямейныя.
17.00 «Пра каханне».
19.15 «Цік-так».
19.30 Ток-шоў «Спрэчная тэрыторыя».
21.00 Серыял «Крымінальны красворд».
22.00 Акцэнты.

7.00, 19.30 «Сад і агарод».
7.05, 10.55, 20.50 «Метэапрагноз».
7.10 Маст. фільм «Страшыдла».
8.45 «К-гульня».
9.00 «Клуб 700».
9.30 «Каралі муай тай».
9.50, 19.45 Серыял «Нікіта».
10.50 Інфармбюро «Міжнароднае».
11.00 Маст. фільм «Гатака».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
17.00 Мультпарад.
17.10 Маст. фільм «Адзіночкі».
18.55 «К-гульня».
19.00 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
19.20 «Навіны кіно».
19.40, 20.55 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Маст. фільм «Перл-Харбар».
23.55 «Начны тэлечат».



7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.05 «ТУ-104. Апошнія словы лётчыка Кузняцова».
10.00, 19.55 Серыял «Віола Тараканава. У свеце злачынных страсцяў».
10.45 Весткі. Дзяжурная часць.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 14.10 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50, 21.00 Серыял «Целаахоўнік».
12.50 Серыял «Пяшчотная пачвара».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.30 «Кулагін і партнёры».
15.00 Суд ідзе.
16.00 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.20 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.45 Серыял «Анёл-ахоўнік».
19.45 Добрай ночы, малышы!
21.55 Серыял «Закон і парадак».
23.10 Весткі+.
23.30 «Код Казначэйства».
0.30 Трылер «Згублены анёл».



6.00 «Сёння раніцай».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.05 «Наша ўсё!».
10.20 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.50 «Маскі-шоў».
11.15 Серыял «Таксістка-2».
13.25, 19.45 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела».
14.25, 20.50 Серыял «Абарона Красіна».
15.20 «Прафесія — рэпарцёр».
15.30, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
22.30 Серыял «Кат».
23.35 «Маскі-шоў».
0.05 «Крымінальная Расія».

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
7.50, 10.15, 23.35 Пятроўка, 38.
8.00, 13.50, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.05 Маст. фільм «Паездкі на старым аўтамабілі».
9.50 «Дэтэктыўныя гісторыі». «Хлеб. Грошы. Пісталет».
10.50 «У цэнтры ўвагі». «Выкрасці шэдэўр».
11.25 Серыял «Адна справа на дваіх».
12.20, 20.05 Серыял «Зорка Эпохі».
13.55 Мультпарад.
14.30, 21.10 «Закон Вольфа».
15.30 Новая «Часінка».
16.55 Дзелавая Масква.
17.15 Сялянская застава.
17.50 «Гарадскі раманс». Серыял.
18.55 Таварам да горада.
22.10 «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Вазьму крэдыт».
23.05 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.55 «Капальні цара Саламона». Маст. фільм.

Адны казалі, што той, хто знойдзе гэтыя капальні, стане вельмі багатым чалавекам на зямлі. Другія — што яго спасцігне страшэннае праклясце.

2.45 «Шчодрае лета». Камедыя.
4.10 «Сто пытанняў даросламу».

9.30 «Eurosport Buzz».
10.00, 19.00, 20.15 Футбол. Ёўрагалы.
11.00, 12.15, 13.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
12.00 Вось гэта дзіва!!!
13.15 Футбол. Го-о-о-ол!!!
15.00 Тэніс. Турнір WTA.
21.30 Бокс. Д. Туа (Самоа)—С. Мантана (Мексіка).
22.00 Бокс.
0.00 Ралі. IRC. Агляд.
0.30 Спідвей. Гран-пры Славеніі.
1.30 Мотаспорт па выхадных.
2.00 Вось гэта дзіва!!!

ФІЛЬМ ДНЯ

ПЕРШЫ 12.10 «ЧАЛАВЕК НІАДКУЛЬ» (СССР, 1961 г.)

Малады антраполаг Паражаеў марыць знайсці дзікае племя «тапі». Яго начальнік Крохалеў лічыць гэту тэорыю выдумкай. У час чарговай экспедыцыі Уладзіміру ўдаецца знайсці дзікуна, які жыве ў гэтым самым племені і... ён прывозіць Дзівака, так яго правзалі за незвычайныя паводзіны, у Маскву.

Рэжысёр — Эльдар Разанаў. **У ролях:** Сяргей Юрскі, Юрый Якаўлеў, Анатоль Папанаў, Людміла Гурчанка, Нінэль Мышкова, Уладзімір Мураўёў, Юрый Бялоў.

СЕРАДА, 3 КАСТРЫЧНІКА



Тэхнічная прафілактыка па Мінску і Мінскай вобласці з 9.05 да 15.00.
5.35, 16.45 Серыял «Права на шчасце».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.55, 23.40 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 19.00, 23.45 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05, 19.55 Серыял «Група Zeta».
9.55, 15.50 Серыял «Блізняты».
10.55, 17.45 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.10 Меладрама «Дзеці Дон-Кіхота».

Урач і яго жонка-касметолаг вядомыя тым, што ўсынаўляюць дзяцей, ад якіх адмовіліся бестальковыя маці.

13.35 «Людзі на граніцы». «Беларуская тундра».
14.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.25 Навіны рэгіёна.
15.30 Серыял «Клава, давай!».
19.35 Зямельнае пытанне.
21.00 Панарама.
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Валенсія»—«Чэлсі».
0.10 Дзень спорту.
0.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд дня.
1.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Селцік»—«Мілан».



6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05, 15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
7.05 «Наша раніца».
Тэхнічная прафілактыка з 9.05 да 15.00.
16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 3.20 Навіны спорту.
16.15 Дэтэктыў «Супермаркет».
17.15, 5.05 «Няхай гаворыць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Зачараваны». Серыял.
18.55 «Таццянін дзень». Серыял.
20.00 Час.
21.05 Серыял «Не радзіся прыгожай».
22.10 «След».
23.30 «Як выбіць аліменты».
0.30 «Фабрыка зорак «дома».
1.05 Серыял «Забойная сіла».
2.05 Серыял «Каварства гор».
3.25 Маст. фільм «Кашмар на вуліцы Вязаў-2: Помста Фрэдзі».
5.45 «Жарт за жартам».

Тэхнічная прафілактыка па Мінску і Мінскай вобласці з 8.50 да 15.15.
7.00 Ранішняя падзарадка.
8.00, 17.30 Серыял «Белінда».
8.50 «Абліччы Еўразіі — дыялог культур». «Вораг народа».
9.20, 16.45 Ядзім дома.
9.50 У гэты дзень.
9.55 Маст. фільм «Садоўнік».
11.40, 18.30 Серыял «Расплата за грахі».
12.35 ПРАсоўванне+.
12.55 Дак. фільм «Жывая гісторыя НЛА: праўда і міфы».
13.40 «Іншыя». Тыпова жаночае злачынства.
14.05 «Слова пісьменніка».
14.30 «Тэатр. Выбранае». «Тэатр-фестываль «Балтыйскі дом». Штрыхі да партрэта».
15.20 Дак. серыял «Паляўнічая адысея».
15.55 Мультсерыял «Добрай раніцы, Мікі Маўс!».
16.25 Серыял «Школа першых ракетак».
19.30 Беларуская часінка.
20.35 Калыханка.
20.55 Серыял «Ярмак».
22.55 Проста праграма.



6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20 «З чаго пачынаецца раніца».
8.40 «Аўтапанарама».
9.00, 20.50 «Салдаты 13». Серыял.
10.00 «Гарачы лёд»:
10.40 «Далёкія сваякі».
11.05 «Рэбека». Серыял.
12.00, 18.25 «За ўсё табе дзякую 2». Серыял.
13.00 «Рэпарцёр СТБ».
13.50 «Надзвычайныя гісторыі».
14.45 «Іншапланецяне». Мультсерыял.
15.10 «Элен і рабяты». Серыял.
16.00 «Лёсам напісаныя радкі».
16.50 «Бабскі бунт».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
20.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малыш».
20.30 «Добро пожаловаться».
22.00 «Мінск і мінчане».
22.55 «Закон і крымінал».
23.00 «Рэактыўны бокс».
23.30 «Дэтэктыўныя гісторыі».
0.20 «Рэдакцыя». Серыял.

4.00, 5.00, 6.00, 7.00 Зараджайся!
4.30, 14.00 Серыял «Маўглі».
5.30 Праграма «Пра каханне».
6.30 Удачная пакупка.
7.30, 18.10 Серыял «На віражы».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 «Прырода — лекар».
9.00 Скрыжаванне. «Пра каханне».
9.30, 19.30 Ток-шоў «Спрэчная тэрыторыя».
10.30 Серыял «Раксалана».
12.00, 22.25 Студыя 60х90.
12.15, 22.30 Маст. фільм «Я родам з дзяцінства».
13.45 Урокі англійскай мовы.
15.00 Планета VISION прадстаўляе...
16.00 «Гадзіна суда». Справы сямейныя.
17.00 Следчыя і экстрасэнсы.
19.15 «Цік-так».
21.00 Серыял «Крымінальны красворд».
22.00 Акцэнты.



7.00, 19.30 «Сад і агарод».
7.05, 10.40, 21.05, 23.15 «Метэапрагноз».
7.10 Маст. фільм «Непапраўны».
9.15 «К-відэа» для дзяцей.
9.30 «Адшукваецца адпачынак».
9.50, 19.45 Серыял «Нікіта».
10.45 Маст. фільм «Перл-Харбар».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
17.00 Мультпарад.
17.10 Маст. фільм «На апошнім дыханні».
18.55 «К-гульня».
19.00 Гурман-клуб.
19.20 «Навіны кіно».
19.40, 21.10 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.15 Маст. фільм «Дзевяць з паловай тыдняў».
23.20 «Начны тэлечат».



7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.05 «Маршал песні. Салаўёў-Сядой».
10.00, 19.55 Серыял «Віола Тараканава. У свеце злачынных страсцяў».
10.45 Весткі. Дзяжурная часць.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 14.10 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50, 21.00 Серыял «Целаахоўнік».
12.50 Серыял «Пяшчотная пачвара». Заключная серыя.
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.30 «Кулагін і партнёры».
15.00 Суд ідзе.
16.00 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.20 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.45 Серыял «Анёл-ахоўнік».
19.45 Добрай ночы, малышы!
21.55 Серыял «Закон і парадак».
23.10 Весткі+.
23.30 «Апошняя песня сышчыка Экіміна».
0.30 Маст. фільм «Псіхапатка».
1.05 «Забойная сіла». Серыял.
2.00 Серыял «Каварства гор».
Тэхнічная прафілактыка з 3.30 да 5.00.
5.05 «Няхай гаворыць» з Андрэем Малахавым.

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
7.50, 10.15, 23.35 Пятроўка, 38.
8.00, 13.50, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.05 Маст. фільм «Першае спатканне».
10.00 «Рэпарцёр».
10.50 «Доказы віны». «Толькі бізнэс».
11.25, 2.45 «Адна справа на дваіх». Серыял.
12.20, 20.05 «Зорка эпохі». Серыял.
13.55 Дзень busла.
14.10 Мультфільм.
14.30, 21.10 «Закон Вольфа». Серыял.
15.30 Новая «Часінка».
16.55 «Рэзананс».
17.15 «21 кабінет».
17.50 «Гарадскі раманс». Серыял.
18.55 «Рэальныя гісторыі». Касмічныя байкі.
22.10 «Вуліца твайго лёсу». Тыя, каго мы кахалі калісьці.
23.05 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.55 «А раніцай яны прачнуліся». Камедыя.
1.50 Футбол. «Тарпеда» (Масква)—«Сібір» (Новасібірск).
3.30 «Тры таполі на Плюшчысе». Маст. фільм.



9.30 Экстрэмальны спорт.
10.00 Лёгкая атлетыка. Залаты гран-пры.
11.00 Веласпорт. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
12.00 Спідвей. Гран-пры Славеніі.
13.00, 1.15 Футбол. Кубак УЕФА.
14.00, 2.15 Вось гэта дзіва!!!
14.45 Тэніс. Таццяна Галавін.
15.00, 19.15 Тэніс. Турнір WTA.
19.00 Футбол. Еўрагалы.
20.15, 21.25, 0.40 Выбранае па серадах.
20.20 Конны спорт.
21.30 Гольф.
23.35, 0.45 Парусны спорт.

ФІЛЬМ ДНЯ

ТБЦ 23.55 «А РАНІЦАЙ ЯНЫ ПРАЧНУЛІСЯ» (РАСІЯ, 2003 г.)

У аснове камедыі ляжыць няскончаная аповесць В.М. Шукшына «А раніцай яны прачнуліся» і тры яго апавяданні: «Крыўда», «Ноччу ў бройлернай», «Прывітанне сівому». Восем герояў фільма прачнаюцца раніцай у выцвярэзніку і кожны ўспамінае, як менавіта ён туды трапіў.

Рэжысёр — Сяргей Ніканенка. **У ролях:** Сяргей Гармаш, Аляксандр Абдулаў, Сяргей Ніканенка, Яўген Стычкін, Уладзімір Бальшоў, Васіль Мішчанка, Ігар Хрысценка, Ігар Бочкін.

ЧАЦВЕР, 4 КАСТРЫЧНІКА



5.35, 16.45 Серыял «Права на шчасце».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.55, 0.30 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 0.40 Навіны.
**7.30, 8.

ПЯТНІЦА, 5 КАСТРЫЧНІКА

5.35, 16.50 Серыял «Права на шчасце».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 19.35 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 0.05 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05, 19.55 Серыял «Група Zета».
9.55, 15.50 Серыял «Блізняты».
10.55, 17.45 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.10 Драма «Халоднае лета 53-га».
14.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.25 Навіны рэгіёна.
15.30 Серыял «Клава, давай!».
21.00 Панарама.
21.40 Баявік «Дзевяць яр-даў-2».
23.35 Фігуры.
0.30 Дзень спорту.
0.40 Драма «Сука-каханне».
3.10 Вось дык шоў!

Тэхнічная прафілактыка ў Салігорску.
6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.55, 3.00 Нашы навіны.
6.05, 15.00 «Раліта. Без комплексаў».
7.05 «Наша раніца».
9.05 Серыял «Таццянін дзень».
10.00 «Модны прыгавор».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.10, 3.20 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Не радзіся прыгожай».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Мая цудоўная няня».
13.40 «Федэральны суддзя».
14.30 «Кантрольная закупка».
16.15 Шматсерыйны фільм «Дачка садоўніка».
17.15 «Няхай гаварыць» з Андрэем Малаховым.
18.20 «Дакументальны дэтэктыў». «Звычайны подзвіг».
18.55 «Поле цудаў».
20.00 Час.
21.05 «Цудоўная пяцёрка».
22.10 «Наша Раша».
23.15 Маст. фільм «21 грам».
1.30 Маст. фільм «Я ажаніўся з забойцам з сякерай».
3.25 Маст. фільм «Болевы прыём».
5.05 «Вясёлыя рабяты». Частка 1-я.
5.35 Маст. фільм «Прыгоды зубнога ўрача».

7.00 «Ранішняя падзарадка».
8.00, 16.55 Серыял «Белінда».
8.50 «Абліччы Еўразіі — дыялог культур». «Апошні прынц стэпу».
9.30 Ядзім дома.
10.00 У гэты дзень.
10.05 Канцэрт «Мелодыі восені».
10.35 Анекдот. LAD.
10.55 Серыял «Расплата за грахі».
11.45 «Амфітрыён». Спектакль.
14.10 «Алімпійская гісторыя». Атланта 1996 г.
15.05 «Спорт, спорт, спорт...» Таццяна Драздоўская.
15.35 Серыял «Вось так мы жывём».
15.50 Мультсерыял «Добрай раніцы, Мікі Маўс!».
16.20 Усё пра бяспеку.
17.55 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў ЕГФ. Мужчыны. БГК ім. Мяшкова (Беларусь) — «Горенье» (Славенія). Прамая трансляцыя.
19.35 Беларуская часінка.
20.40 «Калыханка».
20.55 «Правы чалавека».
21.10 «Цудоўная сямёрка». Эпізод першы.
22.15 Серыял «Ярмак».
23.20 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Керамін» (Мінск)— «Дынама» (Мінск).

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20 «З чаго пачынаецца раніца».
8.40 «Аўтапанарама».
9.00 Серыял «Салдаты 13».
10.00 «Наш дом».
10.40 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
11.05 Серыял «Рэбека».
12.00, 18.25 Серыял «За ўсё табе дзякую 2».
13.00 «Асабісты інтарэс».
13.50 «Сакрэтныя гісторыі».
14.45 Мультсерыял «Іншапланецяне».
15.10 Серыя «Элен і рабаты».
16.00 «Ёсць кантакт».
16.50 «Бабскі бунт».
17.30 «Званая вячэра».
20.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малыш».
20.30 Камедыя «Даверся мужчыне».
22.55 «Відзьма-нявідзьма».
23.35 Баявік «Афіцэр забойнага аддзела».

4.00, 5.00, 6.00, 7.00 Зараджайся!
4.30, 14.00 Серыял «Маўглі».
5.30 За сталом з Бертам Волфам.
6.30 Удачная пакупка.
7.30, 18.10 Серыял «На віражы».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 Арт-рэвалюцыя.
9.00 Даведнік.
9.30 Ток-шоў «Спрэчная тэрыторыя».
10.30 Серыял «Раксалана».
12.00 Студыя 60х90.
12.15, 22.30 Маст. фільм «Вялікая зялёная даліна».
13.45 Урокі англійскай мовы.
15.00 Сливкі общества.
16.00 Парад парадаў.
17.00 Вясельныя вар'яцтвы.
17.55 Дзелавы тыдзень.
18.15 «Руская версія».
18.45 «Слава за хвіліну».
19.45 «Цік-так».
